

НЕРВОВЫЯ КЛЕТКІ УЗНАЎЛЯЮЦЦА

5



ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА КІНО ТРЭБА...

6

25 ЛІПЕНЯ 2020 г.
СУБОТА
№ 143 (29257)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

# «Пытанне ў тым, каб мы былі гатовыя заўсёды абараніць сваю краіну, сваю Айчыну, гэты кавалак зямлі»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў Мар'іну Горку — правёў сустрэчу з актывам ваенных і азнаёміўся з новым спартыўным комплексам**



Фота БелТА.

### Кузня алімпійскіх чэмпіёнаў

Каля новага спартыўнага комплексу Прэзідэнта чакалі жыхары Мар'інай Горкі, каб асабіста павітаць. Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з дзеткамі, пацікавіўся, калі пойдуць у школу. І паабяцаў: яшчэ пагутараць, спярша трэба адкрыць новы комплекс.

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын далажыў кіраўніку краіны, што сёлета ў вобласці ўведзены ў строй тры дзіцячыя садкі, будзе ўведзена яшчэ дзевяць. Пазнаёміў Аляксандр Турчын Прэзідэнта з перспектывамі ўвядзення аб'ектаў сістэмы аховы здароўя і школ, у тым ліку вясковай у Мядзельскім раёне.

Спартыўны аб'ект, аналагічны таму, што адкрыўся ў Мар'інай Горцы, па распараджэнні кіраўніка краіны ў 2021 годзе будзе здадзены ў Міханавічах, яшчэ тры (у Старых Дарогах, Дзяржынску і Уздзе) — не пазней чым у 2022-м.

Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з зоркамі беларускага спорту, наведаў басейны, трэнажорную залу і залу для барацьбы.

«Тут рыхтуюцца алімпійскія чэмпіёны. І ***<u>калі вы — Школа алімпійскага рэзерву, а не выдаяце штогод 20—30 чалавек, — значыць, вы дарма ясце хлеб</u>***. Таму майце на ўвазе: вы тут не проста павінны аднавіць футбалістаў і навучыць плаваць, вы павінны туды, у Мінск, скажам так, выдаць два дзясяткі чалавек, з якіх мы будзем рабіць сапраўдных рэкардсменаў», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што ўсе сталічныя басейны рэнтабельныя і карыстаюцца велізарным попытам. Дарэчы, новы аб'ект у Мар'інай Горцы стаў пятнаццатым басейнам, пабудаваным у нашай краіне за апошнія два гады.

***<u>«Для таго каб тут не проста куляцца, а былі сапраўдныя спартсмены, ёсць усё. І гэта — задача кожнай школы»</u>***, — заключыў Прэзідэнт.

### Не дапусціць напружанасці ўнутры краіны

Першы пункт у плане Прэзідэнта — 5-я асобная брыгада спецыяльнага прызначэння. Падчас знаходжання ў воінскай часці Прэзідэнта азнаёмілі з узорамі вайсковай экіпіроўкі і ўзбраення. Завітаў ён і ў армейскі клуб, дзе размешчаны музей гісторыі і баявой славы 334-га асобнага атрада спецыяльнага прызначэння і самой брыгады. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ў гэтай брыгадзе бывае часта. Невыпадкова, бо злучэнне, на яго думку, «асаблівы атрад нашых Узброеных Сіл».

Дакументам, па якім будзе дзейнічаць беларуская армія ў выпадку вайны, з'яўляецца Ваенная дактрына Беларусі, трэцяя па ліку. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, яна распрацавана зыходзячы з асаблівасцяў вядзення сучасных войнаў.

«За маю бытнасць мы тры ці чатыры разы мадэрнізавалі нашы Узброеныя Сілы, прыстасоўваючы іх да вядзення вайны ў сучасных умовах. І апошняя Ваенная дактрына ў 2018 годзе была прынята. Яна вызначае, як і якія войны мы будзем весці, калі раптам нам давядзецца абараняць нашу Айчыну», — заявіў кіраўнік краіны, сустракаючыся з актывам часці.

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Андрэй Раўкоў падрабязна расказаў пра асаблівасці Ваеннай дактрыны. Пры гэтым ён адзначыў, што сёння рызыкі выклікаў і пагроз для развязвання буйнамаштабнай вайны з удзелам нашай краіны мінімальныя. Для таго каб закласці ў дакумент, аналітыкі даследавалі прычыны, перадумовы канфліктаў і лакальных войнаў. «І таму мы кажам з поўнай адказнасцю, што проста так вайна не пачнецца, яна пачынаецца загадзя, у першую чаргу з унутраных узброеных ваенных канфліктаў, «каляровых» рэвалюцый, магчыма, інспіраваных з-за мяжы, як гэта, як правіла, і было ў тых канфліктах, якія мы вывучалі. Таму мы павінны быць да гэтага заўсёды гатовы», — сказаў Андрэй Раўкоў.

«Дзяржсакратар правільна сказаў, што ***<u>усе войны цяпер пачынаюцца з вулічных пратэстаў, дэманстрацый, потым майданы</u>***. На майдан, калі сваіх няма (у нас мала «майданутых»), іх падцягнуць з боку. Гэта будуць прафесійныя ваенныя, бандыты, якія працавалі і працуюць, спецыяльна рыхтуюцца ў асноўным у рамках ПВК (прыватных ваенных кампаній. — **«Зв.»**) па ўсім свеце і зарабляюць вялікія грошы на правакацыях у тых ці іншых дзяржавах», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, калі яму давялося дзесяць гадоў таму выбіраць брыгады двайнога прызначэння, ён спыніўся на гэтай 5-й брыгадзе і механізаванай брыгадзе ва Уруччы. Вызначацца, якія Узброеныя Сілы неабходна мець краіне, давялося, па словах Аляксандра Лукашэнкі, пасля 2010 года. «Я зразумеў, што нам трэба мець у запасе падрыхтаваных байцоў, падрыхтаваныя часці ва Узброеных Сілах. На ўсякі выпадак. ***<u>Непажадана, каб нам давялося ўжываць Узброеныя Сілы, але ўсякае можа быць»</u>***, — канстатаваў кіраўнік краіны.

Дзве часці, якія выбраў Прэзідэнт, добра падрыхтаваныя і да таго, каб не дапусціць напружанасці ўнутры краіны.

Прэзідэнт расказаў ваеннаслужачым пра сітуацыю, якая складваецца на Блізкім Усходзе, якія сілы там сутыкнуліся, назваўшы падзеі «кіраваным хаосам».

СТАР. 2

Другая радзіма

# ДЗЕ ПЕРШЫ РАЗ СПАЗНАЛА ШЧАСЦЕ...

**Сімпатычны пяціпавярховік у маладым мікрараёне калійшчыкаў у Петрыкаве, што на Гомельшчыне... У новабудоўлі для работнікаў горна-абагачальнага камбіната сваё першае жыллё атрымала сям'я Аляксандра БАНДАРЭНКІ і Яны СЦЕПАНЕНКІ. Навасёлы — перасяленцы з Луганскай вобласці Украіны. Менавіта ў палескім гарадку яны знайшлі сваё простае жыццёвае шчасце, а сэрца назаўжды аддалі Беларусі.**



### «Інтэрн-экстрэмал...»

Пяць гадоў таму маладыя людзі — ураджэнцы Свярдлоўска, што на Луганшчыне, пакінулі родны горад і паехалі шукаць новай долі ў Петрыкаў. Яна Сцепаненка — урач-кардыёлаг, яе сужэнец Аляксандр Бандарэнка — горнавыратавальнік.

— У 2014 годзе я заканчвала навучанне ў медыцынскім універсітэце ў Сімферопалі, — цяпер ужо паўнавартасная петрыкаўчанка Яна Сцепаненка згадвае, як усё пачыналася. — У інтэрнатуру накіравалі ў Луганск. Я прыехала, а на маёй малой радзіме — баі.

Яе родны Свярдлоўск — за 30 кіламетраў ад расійскай граніцы. Баявыя дзеянні праходзілі фактычна тут жа за горадам. На ўскраіне — амаль усе будынкі, кажа, тады знеслі «да крошкі»:

— Былую жаночую калонію цалкам зруйнавалі снарадамі. Аднойчы шахцёры вярталіся з работы на аўтобусе, і хтосьці, незразумела з якога боку, ноччу пачаў страляць па транспарце, загінула шмат людзей. Амаль штодня гучала паветраная трывога. За некалькі соцень метраў ад майго бацькоўскага дому падарвалі машыну з боеприпасамі, яны дэтанавалі, сыплючы асколкамі ва ўсе бакі.

Інтэрна медуніверсітэта Яну Сцепаненку накіравалі ў райбальніцу Луганска.

— Прыйшла ў тэрапеўтычнае аддзяленне на 70 ложкаў. Высветлілася, што з-за баявога становішча больш за 30 % усіх урачоў з'ехалі. Працаваць няма каму. Атрымалася, што загадчык бальніцы, да якой я прыйшла праходзіць інтэрнатуру, паставіла мяне выконваць абавязкі загадчыцы тэрапеўтычнага аддзялення, а я толькі першы тыдзень пасля ўніверсітэта. Гэта быў сапраўды экстрэмальны вопыт, — успамінае Яна.

Тое, што зарплаты не плацілі, кажа малады ўрач, было паўбяды. Увогуле незразумела стала, як жыць, працаваць. Луганскі медуніверсітэт, які накіраваў у інтэрнатуру, — тэрыторыя непрызнанай Луганскай Народнай Рэспублікі. Выходзіла, што ўвесь час, які яна вучылася ў Крыме, афіцыйна нельга пацвердзіць, бо не маглі растлумачыць, ці будуць увогуле выдаваць дыпломы без украінскіх пячатак і афіцыйных дакументаў.

СТАР. 3

# Гаспадыня вёскі



Фота БелТА.

Сёння ў Мінску ва ўрачыстай абстаноўцы ўшануюць «Жанчын года — 2019». Мерапрыемства, якое традыцыйна праводзіцца ў сакавіку, сёлета з аб'ектыўных прычын было перанесена на сярэдзіну лета, але не страціла ад гэтага ні сваёй урачыстай сутнасці, ні прыгажосці.

Прыедзе сёння па заслужаную ўзнагароду і Наталля ПРАКАПУК, гаспадыня аграсядзібы «Валерыя» ў Камянецкім раёне, якая стала пераможцай у намінацыі «Гаспадыня вёскі».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Перагаворы наконт брэксіту зноў зайшлі ў тупік



Вялікабрытаніі і ЕС зноў не ўдалося прыйсці да кампрамісу ў найважнейшых пытаннях для заключэння здзелкі па гандлі і бяспецы, паведаміла The Guardian. Галоўны перагаворшчык ЕС па брэксіце Мішэль Барнье заявіў, што негатоўнасць Лондана паважаць інтарэсы Бруселя робіць «малаімавернай» магчымасць заключэння здзелкі да канца года. Аднак яго брытанскі калега Дэвід Фрост лічыць, што пагадненне магчымае ўжо ў верасні. Выступаючы перад журналістамі па відэасувязі пасля чарговага раўнда перагавораў, Барнье ўдакладніў, што да крайняга тэрміну, калі пагадненне можа быць заключана, каб яго паспелі ратыфікаваць у парламентах, — 31 кастрычніка — засталося ўсяго тры месяцы, а бакі «ўсё яшчэ далёкія» ад таго, каб прыйсці да пагаднення. Так, нягледзячы на «прыкметы кампрамісу» па шэрагу ключавых пытанняў, палітык заявіў, што бакам не ўдалося дасягнуць прагрэсу па двух найбольш складаных кірунках. Гаворка ідзе аб правах еўрапейскіх маракоў у брытанскіх водах і адмове ад зніжэння нарматыўных стандартаў і несправядлівага субсідзіравання бізнесу. The Guardian нагадала, што кіраўнікі дэлегацый правядуць нефармальную сустрэчу на наступным тыдні ў Лондане, а затым яшчэ адзін раўнд афіцыйных перагавораў у сярэдзіне жніўня ў Бруселі.

### Парламент Харватыі ўхваліў новы склад урада краіны

Былі ўхвалены прапановы па стварэнні кабінета міністраў, унесеныя напярэдадні прэм'ер-міністрам Андрэем Пленкавічам, лідарам партыі «Харвацкая дэмакратычная садружнасць», якая перамагла на парламенцкіх выбарах. Яна атрымала ад прэзідэнта краіны Зорана Міланавіча мандат на фарміраванне новага ўрада. Пра гэта паведаміў нацыянальны тэлеканал HRT, які трансляваў абвяшчэнне вынікаў першага пасяджэння вышэйшага заканадаўчага органа краіны новага складу. Па звестках HRT, прэм'ер-міністра падтрымалі 76 дэпутатаў, 59 парламентарыяў прагаласавалі супраць. «Мы сфарміравалі парламенцкую большасць з партнёрамі, з якімі, я ўпэўнены, рэалізуем праграму (новага ўрада. — **«Зв.»**), з якой усе мы згодныя», — падкрэсліў Пленкавіч. У рамках названай праграмы запланавана рэалізацыя пяці прыярытэтаў: сацыяльная стабільнасць, перспектывы развіцця, эканамічны суверэнітэт, узмацненне дзяржаўнасці і глабальная пазнавальнасць. Новы ўрад Харватыі будзе складацца з 16 міністэрстваў замест ранейшых 20.

### Белыя мядзведзі могуць знікнуць да 2100 года



З-за раставання ледзянога покрыва ў Арктыцы палярныя мядзведзі могуць знікнуць да канца бягучага стагоддзя. Ужо зараз драпежнікі паміраюць ад голаду, бо натуральнае асяроддзе іх пражывання знішчаецца. Паводле ацэнак навукоўцаў, калі выкіды вуглякіслага газу ў атмасферу будуць трымацца на цяперашнім узроўні, то глабальнае пацяпленне будзе мець незваротныя наступствы і для папуляцыі белых мядзведзяў. Змяненне клімату ў Арктыцы цяпер адбываецца ўдвая хутчэй, чым у іншых рэгіёнах планеты. Палярныя мядзведзі могуць правесці каля 200 дзён без ежы, але ім становіцца ўсё складаней здабываць сабе корм, бо яны палююць на арктычных цюленяў, якія жывуць у льдах. Калі маса цела жывёлы на 20 % меншая за норму, то замест 200 дзён без ежы яна зможа пражыць толькі 125. Па звестках экспертаў, сёння ў свеце налічваецца каля 25 тысяч белых мядзведзяў.

ISSN 1990 - 763X

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 жніўня выступіць са штогадовым Пасланнем беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь.**
- Украінскія артысты падарылі віцебскаму музычнаму каледжу пяць піяніна.
- **«Белкартаграфія» выпусціла да «Вішнёвага фестывалю» карту Глыбоцкага раёна.**




- Расія аднаўляе міжнародныя авіязносіны з 1 жніўня.
- **У Беларусі выберуць найлепшы экапраект.**
- Урад рыхтуе новую праграму па павелічэнні спажывання электраэнергіі.

Прыёмная кампанія — 2020

# Сем дзён, каб вызначыцца з прафесіяй

## Прыём дакументаў у ВНУ распачынаецца 25 ліпеня

**На ўзровень вышэйшай адукацыі сёлета плануецца прыняць крыху больш за 27 тысяч абітурыентаў на бюджэт і каля 28 тысяч — на платную форму навучання. Набор на бюджэтныя месцы павялічыцца на медыцынскіх, тэхнічных, асобных педагагічных і IT-спецыяльнасцях, а таксама на спецыяльнасцях фізкультуры і спорту.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Між іншым, беларускія ВНУ набіраюць сёлета абітурыентаў на шэраг новых спецыяльнасцяў. Яны звязаны пераважна з тэхналогіямі, праграмаваннем і эканомікай. У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце на энергетычным факультэце адкрыецца спецыяльнасць «Праектаванне і эксплуатацыя атамных і электрычных станцый». На прыборабудаўнічым факультэце на спецыяльнасці «Біятэхнічныя медыцынскія прыборы і сістэмы» будуць адкрыты дзве новыя спецыялізацыі — «Тэхнічныя сродкі дыягностыкі і лячэння» і «Тэхнічныя сродкі замены органаў і рэабілітацыя».

Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт прапануе абітурыентам дзве новыя спецыяльнасці: «Вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій» (інжынерны факультэт) і «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» (факультэт эканомікі і права).

СТАР. 3

# «Пытанне ў тым, каб мы былі гатовыя заўсёды абараніць сваю краіну, сваю Айчыну, гэты кавалак зямлі»

## Заўсёды быць гатовымі



Фота БелТА.

На вуліцы Аляксандра Лукашэнку чакалі жыхары, якім кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што яго візіт у Мар'іну Горку быў запланаваны за паўгода.

«Я тут чацвёрты раз, у гэтым падраздзяленні, таму мне было цікава паглядзець, як яны сябе адчуваюць у гэты востры палітычны перыяд. ***Калі вам нехта скажа, што Лукашэнка тут прыехаў прымушаць ваенных на вуліцы парадак наводзіць (хоць гэтая часць якраз па сваёй спецыялізацыі, калі, крый божа, дзесьці нейкі майдан, можа быць задзейнічана па законе для навядзення парадку) — але пытанне не ў гэтым, пытанне ў тым, каб мы былі гатовыя заўсёды абараніць сваю краіну, сваю Айчыну, гэты кавалак зямлі,*** на якім жыць не толькі нам, але і вось дзеткам», — абазначыў сваю галоўную мэту Вярхоўны галоўнакамандуючы.

А новы спартыўны комплекс стаў сапраўдным падарункам. Гэта магчымасць не толькі для спартсменаў, але і для ўсіх мар'інагорцаў прытрымлівацца здаровага спосабу жыцця.

«Гэтая хвароба, якая прайшлася па ўсім свеце і нас добра зачапіла, паказала: той, хто фізічна працаваў, хто займаецца спортам, практычна не хварэў. А калі і хварэў, то тры-чатыры дні. Я хачу, каб вы былі здаровыя», — звярнуўся да грамадзян Аляксандр Лукашэнка.

Учора Мар'іна Горка адзначала 65-годдзе. З днём горада жыхароў «цудоўнага куткa» нашай краіны не мог не павіншаваць і Прэзідэнт.

«Я не пажартаваў, калі сказаў, што ў вас усё ёсць і вы на курорце жывяце, — гэта адзін з найпрыгажэйшых куткоў нашай Беларусі. І зусім яшчэ малады, зялёны, 65 гадоў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы і паабяцаў падставіць плячо, калі нешта для горада трэба зрабіць.

Гаспадары падрыхтавалі Аляксандру Лукашэнку падарунак у адказ — вялікі кошык славутага мар'інагорскага марожанага. «У нас не прападзе!» — адрэагаваў Прэзідэнт і папрасіў малых дапамагчы з пачастункам.

Па дарозе да картэжу чарговы раз адбылася незапланаваная размова лідара краіны з гараджанамі, якія сабраліся стыхійна. І, вядома, ён не змог прайсці міма. Да Прэзідэнта звярнуліся з просьбай забяспечыць дзецям магчымасць займацца біятлонам і лыжнымі гонкамі, арганізаваць палёты з Мінска ў Севастопаль, дапамагчы з жыллём ваеннаму пенсіянеру, з асфальтаваннем дарог у горадзе, разабрацца са справамі некаторых асуджаных. Цікавіліся магчымасцю аднаўлення вытворчых магутнасцяў у горадзе, каб мар'інагорцы не ездзілі на работу ў сталіцу. Аляксандр Лукашэнка даручыў прадставіць варыянты вытворчасцяў, якія могуць быць створаны ў горадзе. Калі яны прыйдуцца дарэчы, Прэзідэнт паабяцаў падключыцца да справы.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Варвара МАРОЗАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Блізкая ўлада

# Прапановы вітаюцца

**Асабісты прыём грамадзян і прамыя тэлефонныя лініі, звароты ў пісьмовым выглядзе і па электроннай пошце... У Рэспубліканскім грамадскім аб'яднанні «Белая Русь» працягваецца інтэнсіўная работа ў фармаце грамадскіх прыёмных. Праблемныя пытанні, прапановы і пажаданні жыхароў разглядаюцца на рэгіянальным узроўні і па меры неабходнасці перадаюцца ў цэнтральны штаб. У гэтым працэсе задзейнічаны дэпутацкі корпус і актыў РГА «Белая Русь».**



**Упаўнаважаны РГА «Белая Русь», генеральны дырэктар СП ААТ «Спартак» Алег ЖЫДКОЎ прымае звароты.**

Напярэдадні ў Гомелі асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію правёў **упаўнаважаны РГА «Белая Русь», генеральны дырэктар СП ААТ «Спартак» Алег ЖЫДКОЎ**. Да яго звярнуліся жыхары Гомеля. Дэпутат Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў упэўнены, што ў вырашэнні надзённых праблем насельніцтва роля такой формы работы са зваротамі грамадзян вельмі значная:

— У перыяд выбарчых кампаній актыўнасць насельніцтва традыцыйна ўзрастае. Гомельская вобласць — не выключэнне. Звычайна людзі прыходзяць з прапановамі і праблемамі, з якімі сутыкаюцца ў паўсядзённым жыцці.

І вось акрэслены пачатак работы грамадскай прыёмнай... Першы тэлефонны зварот, на сувязі гамяльчанка — Любоў Асадчая. Жанчына расказвае, што жыве адна, але пажылы ўзрост і сур'ёзныя праблемы са здароўем не дазваляюць не тое што самастойна абслугоўваць сябе ў побыце, але ўвогуле жыць самастойна.

Алег Мікалаевіч цікавіцца аказаннем ёй паслуг сацыяльнымі службамі: магчыма, патрэбна дадатковая прапрацоўка гэтага пытання. Важна таксама, ці ёсць дзеці або сваякі ў пенсіянеркі і чаму яны не клапоцяцца пра пажылога чалавека.

— Дачка жыве ў Тураве, там работа і жыллё, — дзеліцца састарэлая жанчына і просіць кругласутачнага дагляду.

Дэпутат запэўніў, што звяжацца з сацыяльнымі службамі па месцы пражывання гамяльчанкі, але падкрэсліў, што неабходна, каб родныя таксама не заставаліся ўбаку ад праблемы. Алег Жыдкоў прапанаваў: калі дачка гамяльчанкі згодзіцца пераехаць да маці, каб яе даглядаць як належыць, то дэпутат, у сваю чаргу, гатоў дапамагчы ёй уладкавацца на работу.

Між тым паралельна з тэлефоннымі зваротамі ў прыёмнай ужо чарга з тых, хто прыйшоў на асабісты прыём. Людзі запісаліся загадзя.

Гамяльчанін Дзмітрый Кунін завітаў да дэпутата з заканадаўчай ініцыятывай. Прадпрымальнік расказвае, што некалькі гадоў таму яго бізнес-праект «прагарэў». Прайшоўшы ўсе стадыі санацыі прыватнага прадпрыемства і банкрутства, мужчына ўпэўнены: яго вопыт можа быць карысны для заканатворчасці ў гэтай сферы.

Пажылая сямейная пара — Аляксей і Марыя Шаўчэнкі з Гомеля — прыйшла на прыём, каб атрымаць тлумачэнне ў нюансах падаткаабкладання. Пенсіянеры паскардзіліся, што праз грашовыя пераводы ад дачкі з-за мяжы іх «пераследуюць» спецыялісты падатковай інспекцыі. Зварот гамяльчан адразу пераадрасуецца кіраўніцтву падатковай службы па месцы пражывання пажылой пары. Сям'я атрымае ўсе неабходныя тлумачэнні па сваім звароце.

Разабрацца па сутнасці скаргі папрасіў яшчэ адзін наведвальнік грамадскай прыёмнай — гамяльчанін Рыгор Бабкоў. Пенсіянер абураны вынікамі неаднаразовых праверак дзейнасці кіраўніцтва гаражнага кааператыва, членам якога ён таксама з'яўляецца.

На прамую лінію да ўпаўнаважанага паступіў і калектыўны зварот. Яго аўтары — жыхары шматпавярховак па вуліцы Мазурава. Маладыя сем'і з дзецьмі папрасілі пракансультаваць, як ініцыяваць узвядзенне новых дзіцячых пляцовак.

Дэпутат растлумачыў, што пры актыўнай пазіцыі жыхароў, якія маюць намер фінансава ўдзельнічаць у аднаўленні дзіцячых гульнявых зон, лягчэй знасці спонсараў сярод прадпрыемстваў горада.

Між тым Алег Жыдкоў адзначыў, што ў якасці ўпаўнаважанага «Белай Русі» ў фармаце грамадскіх прыёмных ужо правёў сустрэчы з грамадзянамі і прамыя тэлефонныя лініі ў Буда-Кашалёўскім, Веткаўскім, Добрушскім, Гомельскім і Калінкавіцкім раёнах. У большасці звароты жыхароў райцэнтраў датычыліся прыватных бытавых праблем і пытанняў камунальнага кірунку. Аднак паступіў шэраг цікавых грамадскіх ініцыятыў і прапаноў. Адна з іх, напрыклад, — пажаданне ад работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый, якія імкнуцца замацавацца ў раёнах, узводзіць як мага большую колькасць арэнднага жылля.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

З нагоды

# Пераможцы ў белых халатах

**У Віцебску ўшаноўвалі медыкаў, якія былі і застаюцца на перадавой у барацьбе з COVID-19.**

Нямала сярод іх тых, каму давялося часова перакваліфікавацца і пачаць займацца «вузкай» няпрофільнай справай — ваяваць з інфекцыяй і вынікамі яе ўздзеяння. У такім выпадку многім трэба было хутка атрымліваць адпаведныя веды і навыкі, бо прафесійных інфекцыяністаў, рэаніматолагаў, анестэзіёлагаў не хапала. Цяпер пра гэта згадваюць як пра эпізоды гісторыі, бо ўжо нічога экстраардынарнага не фіксуецца.

У Віцебскім гарадскім выканаўчым камітэце каля васьмідзесяці ўрачоў, медыцынскіх сясцёр, прадстаўнікоў малодшага медыцынскага персаналу, кіроўцаў «хуткай», работнікаў цэнтраў рэабілітацыі, іншых прадстаўнікоў сістэмы аховы здароўя атрымалі ганаровыя граматы і падзякі. Гэтыя дакументы — прызнанне заслуг медыкаў кіраўніцтвам органаў аховы здароўя рознага ўзроўню: ад рэспубліканскага да раённага. Галіновы прафсаюз, безумоўна, таксама палічыў важным падзякаваць героям нашага часу.

Цёплыя словы кранулі галоўных герояў цырымоніі. Яны былі прыемна здзіўлены тым, што работнікі СМІ часам вельмі настойліва, літаральна стоячы ў чарзе, прасілі даць каментарыі, падзяліцца ўспамінамі, расказаць пра тое, чым займаюцца сёння.



Фота Алега КЛІМОВІЧА.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама Міхаіл ВІШНЯВЕЦКІ віншуе калегу.**

«Зоркамі» медыкі адчуваць сябе не прывыклі і падчас інтэрв'ю, хвалюючыся, сціпла падкрэслівалі, што займаліся і працягваюць займацца любімай справай. Так, нялёгкай, часам небяспечнай, але ў няпросты час не маглі не падключыцца да барацьбы з COVID-19.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама Міхаіл ВІШНЯВЕЦКІ**, віншуючы калег, нагадаў, што Віцебшчына стала першай вобласцю ў краіне, якая сутыкнулася з праблемай распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі.

Ён адзначыў, што медыкі — работнікі бальніц, ФАПа, паліклінік і іншых лячэбных устаноў поўначы краіны — не пакладаючы рук, самаадданa выконвалі свой прафесійны абавязак. Дзяжурствы суткамі, без выхаду за межы месца работы, спробы знайсці эфектыўнае лячэнне раней невядомай інфекцыі, пра якую можна было напачатку прачытаць толькі ў СМІ, — усё гэта пацвярджае, што нашы медыкі — прафесіяналы з вялікай літары.

**Старшыня Віцебскага гарвыканкама Вадзім ЗАРАНКІН** упэўнены, што беларуская сістэма аховы здароўя можа справіцца з любымі выклікамі і працуе надзейна. Мэр канстатаваў, што ў барацьбе з вірусам дапамагла кансалідацыя органаў улады, ініцыятараў аказання падтрымкі медыкам з недзяржаўнага сектара эканомікі, нераўнадушных грамадзян.

**Старшыня віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя Уладзіслаў МУЖЫЧЭНКА** агучыў словы падзякі і захаплення ад таго, як яго калегі ў белых халатах, забыўшы пра асабістае, кінуліся ў бой з вельмі небяспечным, непрадказальным, незразумелым для медыкаў усяго свету ворагам.

На сёння на поўначы краіны напружанасці няма. Як адзначыў кіраўнік сістэмы аховы здароўя рэгіёна, прыклады, калі землякі пакутуюць ад пнеўманіі, вельмі рэдкія. Сітуацыя дастаткова спакойная.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Открытое акционерное общество**
**«Небанковская кредитно-финансовая организация**
**«Белинкасгрупп»**
(www.belincasgroup.by)

Финансовая отчетность за 2019 год

## Отчет о финансовом положении на 31 декабря 2019 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2019 год | 2018 год (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 5 | 79 086 | 7 773 |
| Средства в банках | 6 | – | 26 539 |
| Начисленные доходы по основной деятельности | 7 | 6 101 | 384 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 8 | – | 8 778 |
| Основные средства | 9 | 54 134 | 57 918 |
| Нематериальные активы | 10 | 1 069 | 463 |
| Актив в форме права пользования | 3, 11 | 1 946 | – |
| Отложенные активы по налогу на прибыль | 12 | 3 118 | 4 592 |
| Прочие активы | 14 | 2 004 | 771 |
| **Итого активы** | | **147 458** | **107 218** |
| **Обязательства** | | | |
| Обязательства по предоставлению денежных средств | | 29 944 | – |
| Текущее обязательство по налогу на прибыль | 12 | 189 | – |
| Обязательства по аренде | 3 | 2 072 | – |
| Прочие обязательства | 14 | 4 046 | 925 |
| **Итого обязательства** | | **36 251** | **925** |
| **Собственный капитал** | 15 | | |
| Уставный капитал | | 99 817 | 99 817 |
| Нераспределенная прибыль | | 11 390 | 6 476 |
| **Итого собственный капитал** | | **111 207** | **106 293** |
| **Итого собственный капитал и обязательства** | | **147 458** | **107 218** |

## Отчет о совокупном доходе за год, закончившийся 31 декабря 2019 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2019 год | 2018 год (пересчитано) |
|---|---|---|---|
| Доходы по услугам и комиссии | 17 | 13 157 | 207 |
| Доходы по перевозке и инкассации | 18 | 12 580 | 145 |
| Доходы от аренды | | 8 391 | 5 118 |
| Прочие доходы | | 66 | 84 |
| Восстановление/(расходы) по кредитным убыткам | 13 | 449 | (463) |
| Расходы на оплату труда | 19 | (18 806) | (2 319) |
| Амортизация | | (5 952) | (1 796) |
| Прочие операционные расходы | 19 | (7 265) | (1 429) |
| **Операционная прибыль** | | **2 620** | **(453)** |
| Процентные доходы | 20 | 4 101 | 2 337 |
| Процентные расходы | | (144) | – |
| **Прибыль до налогообложения** | | **6 577** | **1 884** |
| Расход по налогу на прибыль | 12 | (1 663) | (704) |
| **Чистая прибыль за год** | | **4 914** | **1 180** |
| Прочий совокупный доход | | – | – |
| **Итого совокупный доход за год** | | **4 914** | **1 180** |

## Отчет об изменениях в собственном капитале за год, закончившийся 31 декабря 2019 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Уставный капитал | Нераспределенная прибыль | Итого |
|---|---|---|---|
| **На 30 марта 2018 года** | – | – | – |
| Выпуск акционерного капитала (пересчитано) | 99 817 | – | **99 817** |
| Признание отложенных налогов в отношении вклада основных средств в уставный капитал (пересчитано) | – | 5 296 | **5 296** |
| Итого совокупный доход за год (пересчитано) | – | 1 180 | **1 180** |
| **На 31 декабря 2018 года (пересчитано)** | **99 817** | **6 476** | **106 293** |
| Итого совокупный доход за год | – | 4 914 | **4 914** |
| **На 31 декабря 2019 года** | **99 817** | **11 390** | **111 207** |

## Отчет об изменениях в собственном капитале за год, закончившийся 31 декабря 2019 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|
| **Движение денежных средств от операционной деятельности** | | | |
| Доходы по услугам и комиссии полученные | | 10 147 | 6 |
| Доходы по перевозке и инкассации полученные | | 9 621 | 116 |
| Доходы от аренды полученные | | 8 405 | 4 930 |
| Прочие доходы полученные | | 102 | 60 |
| Операционные расходы уплаченные | | (25 352) | (2 842) |
| **Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств** | | **2 923** | **2 270** |
| *Изменение операционных активов и обязательств* Чистое увеличение прочих активов | | (1 215) | (778) |
| Чистое увеличение обязательств по зачислению денежных средств клиентам | | 29 944 | – |
| Чистое увеличение прочих обязательств | | 2 287 | 94 |
| **Чистый приток денежных средств от операционной деятельности** | | **33 939** | **1 586** |
| **Движение денежных средств от инвестиционной деятельности** | | | |
| Чистый возврат/(размещение) депозитов | | 26 582 | (26 000) |
| Проценты полученные | | 4 318 | 1 538 |
| (Приобретение) инвестиционных ценных бумаг | | – | (8 959) |
| Продажа инвестиционных ценных бумаг | | 8 959 | – |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | | (1 836) | (2 399) |
| **Чистый приток/(отток) денежных средств от инвестиционной деятельности** | | **38 023** | **(35 820)** |
| **Движение денежных средств от финансовой деятельности** | | | |
| Поступления от выпуска акций | | – | 42 029 |
| Выплаты, направленные на погашение обязательства по аренде | | (670) | – |
| **Чистый (отток)/приток денежных средств от финансовой деятельности** | | **(670)** | **42 029** |
| Влияние начисления резерва на денежные средства и их эквиваленты | | 21 | (22) |
| Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов | | 71 313 | 7 773 |
| **Денежные средства и их эквиваленты, на начало года** | **5** | **7 773** | **–** |
| **Денежные средства и их эквиваленты, на конец года** | **5** | **79 086** | **7 773** |

Текущий налог на прибыль в 2019 году и 2018 году не уплачивался. В 4 квартале 2019 года НКФО начислила обязательство по налогу на прибыль в сумме 189 тыс. руб., оплата налога на прибыль была произведена в марте 2020 года.

**Подписано и утверждено к выпуску от имени Правления НКФО**

Посканной А.С. — Председатель Правления

Ероховец Н.А. — Главный бухгалтер

14 апреля 2020 года

УНП 807000270

EY
Совершенствуя бизнес, улучшаем мир

Ernst & Young LLC
Klary Tsetkin st, 51A, 15 th floor
Minsk, 220004, Republic of Belarus
Tel: +375 (17) 240 4242
Fax: +375 (17) 240 4241
www.ey.com.by

ООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Клары Цеткин, 51А, 15-й этаж
Тел.: +375 (17) 240 4242
Факс: +375 (17) 240 4241

## Аудиторское заключение независимой аудиторской организации по финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп» за период с 1 января по 31 декабря 2019 года

Председателю правления Открытого акционерного общества
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»
Г-ну А.С. Посканному

Акционерам, Наблюдательному совету и Аудиторскому комитету
Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

***Мнение***

Мы провели аудит финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп» (далее – «НКФО»), состоящей из отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2019 г., отчета о совокупном доходе, отчета об изменениях в собственном капитале и отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к финансовой отчетности, включая краткий обзор основных положений учетной политики.

По нашему мнению, прилагаемая финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение НКФО по состоянию на 31 декабря 2019 г., а также ее финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (МСФО).

***Основание для выражения мнения***

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь *«Об аудиторской деятельности»*, национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь, и Международными стандартами аудита (МСА). Наши обязанности в соответствии с этими правилами и стандартами описаны далее в разделе *«Ответственность аудиторской организации за аудит финансовой отчетности»* нашего заключения. Мы независимы по отношению к НКФО в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров Совета по международным стандартам этики для бухгалтеров (включая международные стандарты независимости) (Кодекс СМСЭБ) и этическими требованиями, применимыми к нашему аудиту финансовой отчетности в Республике Беларусь, и нами выполнены прочие этические обязанности в соответствии с этими требованиями и Кодексом СМСЭБ. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения.

***Ключевые вопросы аудита***

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам. В отношении каждого из указанных ниже вопросов наше описание того, как соответствующий вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Ответственность аудиторской организации за аудит финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этим вопросам. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанных ниже вопросов, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой финансовой отчетности.

| Ключевой вопрос аудита | Как соответствующий ключевой вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита |
|---|---|
| ***Оценка справедливой стоимости основных средств, полученных НКФО в качестве вклада в уставный фонд*** | |
| По состоянию на 31 декабря 2019 года балансовая стоимость основных средств НКФО является существенной.<br>Руководство НКФО осуществило ретроспективный пересчет сравнительных данных в связи с исправлением ошибки, связанной с ранее некорректно оцененной справедливой стоимостью основных средств, полученных НКФО от акционеров в качестве вклада в уставный капитал.<br>Методы оценки справедливой стоимости основных средств могут носить субъективный характер и основываться на различных допущениях. Различные методы оценки и использование допущений могут оказывать существенное влияние на результат оценки справедливой стоимости. В силу значительного использования профессионального суждения оценка справедливой стоимости основных средств рассматривается нами как ключевой вопрос аудита.<br>Информация о стоимости основных средств, а также подход руководства НКФО к оценке справедливой стоимости описаны в Примечаниях 3, 4 и 9 к финансовой отчетности.<br>Информация о пересчете сравнительных данных представлена в Примечании 2 к финансовой отчетности. | Наши аудиторские процедуры включали в себя анализ компетентности и объективности независимого оценщика, привлеченного руководством НКФО, изучение принятых существенных допущений, а также сопоставление исходных данных, использованных при оценке, с доступной рыночной информацией о стоимости аналогичных объектов и иными данными, наблюдаемыми на рынке. Для анализа методологии оценки и принятых допущений нами были привлечены собственные специалисты в области оценки недвижимости и движимого имущества.<br>Мы проанализировали информацию об оценке справедливой стоимости основных средств, а также о пересчете сравнительных данных, раскрытую в примечаниях к финансовой отчетности. |
| ***Признание и оценка комиссионных доходов и доходов от оказания услуг по инкассации, перевозке и хранению ценностей по договорам с клиентами*** | |
| Вопрос признания и оценки комиссионных доходов и доходов от оказания услуг по инкассации, перевозке и хранению ценностей по договорам с клиентами (далее – «выручка по договорам с клиентами») являлся ключевым вопросом аудита, поскольку их сумма является существенной для финансовой отчетности.<br>Информация о выручке НКФО по договорам с клиентами представлена в Примечаниях 17, 18 к финансовой отчетности. | Мы рассмотрели примененную учетную политику в отношении признания выручки по договорам с клиентами.<br>Мы изучили условия договоров оказания услуг на предмет определения момента выполнения критериев признания выручки по договорам с клиентами и на выборочной основе получили подтверждение остатков дебиторской задолженности от клиентов.<br>На выборочной основе мы сопоставили данные бухгалтерского учета с актами оказания соответствующих услуг.<br>Мы выполнили аналитические процедуры, которые состояли, среди прочего, в изучении динамики доходов по месяцам на предмет выявления нетипичных колебаний (по видам услуг и категориям покупателей), в сопоставлении со сравнительной информацией за прошлый период и с плановыми показателями.<br>Мы также рассмотрели информацию о выручке по договорам с клиентами, раскрытую в Примечаниях к финансовой отчетности. |

***Прочие сведения***

Аудит финансовой отчетности НКФО за год, закончившийся 31 декабря 2018 года, был проведен другой аудиторской организацией, которая в аудиторском заключении от 28 июня 2019 года выразила о данной отчетности мнение с оговоркой в связи с тем, что методы и подходы, применявшиеся при оценке недвижимого и движимого имущества при отражении вклада в уставный капитал в финансовой отчетности за 2018 год, в недостаточной степени использовали наблюдаемую рыночную информацию, вследствие чего результаты оценки не могут быть использованы в качестве справедливой стоимости для целей подготовки отчетности по МСФО.

***Ответственность руководства и Наблюдательного совета ОАО «НКФО «Белинкасгрупп» за финансовую отчетность***

Руководство несет ответственность за подготовку и достоверное представление указанной финансовой отчетности в соответствии с МСФО и за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок.

При подготовке финансовой отчетности руководство несет ответственность за оценку способности НКФО продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать НКФО, прекратить ее деятельность или когда у руководства нет реальной альтернативы таким действиям.

Наблюдательный совет ОАО «НКФО «Белинкасгрупп» несет ответственность за надзор за процессом подготовки финансовой отчетности НКФО.

***Ответственность аудиторской организации за аудит финансовой отчетности***

Наши цели заключаются в получении разумной уверенности в том, что финансовая отчетность в целом не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок, и в выпуске аудиторского заключения, содержащего наше мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь *«Об аудиторской деятельности»*, национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь, и Международными стандартами аудита, всегда выявит существенное искажение при его наличии. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что по отдельности или в совокупности они могли бы повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой финансовой отчетности.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь *«Об аудиторской деятельности»*, национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь, и Международными стандартами аудита, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- ▶ выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибок, так как недобросовестные действия могут включать сговор, подлог, умышленный пропуск, искаженное представление информации или действия в обход системы внутреннего контроля;
- ▶ получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля НКФО;
- ▶ оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность оценочных значений, рассчитанных руководством, и раскрытия соответствующей информации;
- ▶ делаем вывод о правомерности применения руководством допущения о непрерывности деятельности и, на основании полученных аудиторских доказательств, вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, которые могут вызвать значительные сомнения в способности НКФО продолжать непрерывно свою деятельность. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в нашем аудиторском заключении к соответствующему раскрытию информации в финансовой отчетности или, если такое раскрытие информации является ненадлежащим, модифицировать наше мнение. Наши выводы основаны на аудиторских доказательствах, полученных до даты нашего аудиторского заключения. Однако будущие события или условия могут привести к тому, что НКФО утратит способность продолжать непрерывно свою деятельность;
- ▶ проводим оценку представления финансовой отчетности в целом, ее структуры и содержания, включая раскрытие информации, а также того, представляет ли финансовая отчетность лежащие в ее основе операции и события так, чтобы было обеспечено их достоверное представление.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с Наблюдательным советом и Аудиторским комитетом ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированном объеме и сроках аудита, а также о существенных замечаниях по результатам аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, если мы выявляем таковые в процессе аудита.

Мы также предоставляем Наблюдательному совету и Аудиторскому комитету ОАО «НКФО «Белинкасгрупп» заявление о том, что мы соблюдали все соответствующие этические требования в отношении независимости и информировали их обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать оказывающими влияние на нашу независимость, а в необходимых случаях – о соответствующих мерах предосторожности.

Из тех вопросов, которые мы довели до сведения Наблюдательного совета и Аудиторского комитета ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», мы определяем вопросы, которые были наиболее значимыми для аудита финансовой отчетности за текущий период, и которые, следовательно, являются ключевыми вопросами аудита. Мы описываем эти вопросы в нашем аудиторском заключении, кроме случаев, когда публичное раскрытие информации об этих вопросах запрещено законом или нормативным актом, или когда в крайне редких случаях мы приходим к выводу о том, что информация о каком-либо вопросе не должна быть сообщена в нашем заключении, так как можно обоснованно предположить, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят общественно значимую пользу от ее сообщения.

Партнер по аудиту, ответственный за задание, по результатам которого выпущено настоящее аудиторское заключение независимой аудиторской организации – Лащенко П.А.

Лащенко П.А.
Генеральный директор
ООО «Эрнст энд Янг», FCCA
14 апреля 2020 года

Ярмакович О.М.
Начальник отдела аудита
ООО «Эрнст энд Янг», FCCA

***Сведения об аудируемом лице***

Наименование: Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 30 марта 2018 года, регистрационный № 807000270.

Местонахождение: 220028, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23.

***Сведения об аудиторской организации***

Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг»

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 7 апреля 2005 года за № 190616051.

Является членом Аудиторской палаты с 26 декабря 2019 года.

Регистрационный номер записи аудиторской организации в аудиторском реестре – 10051, дата включения в аудиторский реестр – 1 января 2020 года.

Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, 51А, 15-й этаж.

ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ!

# ПАЖАР УБАЧЫЦЬ СПАДАРОЖНІК



**Сёння ў Беларусі адзначаецца Дзень пажарнай службы. Звычайна ў выхадныя напярэдадні гэтага свята ратавальнікі ладзілі вялікую святочную праграму ў сталічным парку Горкага, куды збіраліся тысячы чалавек. Сёння ж на гэтай пляцоўцы запланаваны святочны канцэрт, парад плавальных сродкаў, а таксама выстаўка спецыяльнай тэхнікі і дэманстрацыя як пажарна-тэхнічнага ўзбраення, так і элементаў баявой работы.**

Пры гэтым грэх, згадзіцеся, абмінуць увагай прафесійнае свята спецыялістаў, якія заўсёды спяшаюцца на дапамогу. Таму карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў Рэспубліканскі цэнтр кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі. Ён функцыянуе з 1999 года, з таго часу, як ведамства было вылучана са складу МУС. А некалькі гадоў таму Цэнтр пераехаў у новы сучасны будынак у цэнтры горада.

— У першую чаргу мы назіраем за крыніцамі з'яў, якія могуць нашкодзіць жыццю і здароўю чалавека або аб'ектам інфраструктуры, — адзначае **галоўны спецыяліст аддзела маніторынгу і прагназавання надзвычайных сітуацый Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Аляксей АНДРЭЕНКА.** — У нашым арсенале разнастайныя сродкі маніторынгу — пункты наземнага назірання, авіяцыйны, і касмічны. Усе яны дазваляюць на ранняй стадыі заўважыць небяспеку.

Асабліва гэта важна ў выпадку пажараў у экасістэмах. Красавік у Беларусі апошнім часам стаў цёплы і засушлівы, а вось дастатковае снегавое покрыва ўтвараецца далёка не заўжды. Як вынік — складваецца вельмі спрыяльная абстаноўка для таго, каб дзесьці ў гушчары ўзнікла ўзгаранне праз недатушаную цыгарэту або вогнішча. У зоне максімальнай рызыкі — поўдзень Беларусі, які мала таго што больш церпіць ад недахопу ападкаў і вышэйшых тэмпературных паказчыкаў, дык у яго праз балоты часам і падабрацца вельмі няпроста. Тут на дапамогу прыходзіць спадарожнік.

— Трэба таксама ўлічваць, што частка Гомельскай вобласці мяжуе з зонай адчужэння Чарнобыльскай АЭС з украінскага боку, — працягвае суразмоўца. — Такім чынам, калі ўзнікае пажар у той мясцовасці, то наземнымі сродкамі адсачыць яго своечасова вельмі складана. Вось таму ён і пашыраецца да вялікіх маштабаў, наносячы значны ўрон, як гэта было сёлета. Каб такога не дапусціць на нашай тэрыторыі, мы задзейнічаем сістэму касмічнага зандзіравання Зямлі. За суткі некалькі дзясяткаў разоў атрымліваем фотаздымкі, якія дазваляюць выявіць пункты, што патэнцыйна могуць аказацца пажарамі. Інфармацыя пра гэта тут жа перадаецца ў нашы тэрытарыяльныя падраздзяленні, якія і выходзяць на сувязь з уласнікамі зямлі, для таго каб удакладніць, што ж там адбываецца. Калі ніякай інфармацыі атрымаць не ўдаецца, то ратавальнікі на месцах адпраўляюцца высвятляць сітуацыю. Такім чынам пажар можна ліквідаваць на ранняй стадыі. Больш за тое, касмічны апарат дазваляе бачыць скрозь дым і рэгістраваць нізавыя пажары — а менавіта яны разносяць агонь на большую тэрыторыю. Дарэчы, спадарожнік дапамагае ўбачыць і тарфяны пажар. Шчыльнасць дыму ад такога агню вельмі нізкая, і здалёк ён нагадвае туман. Апарат жа вызначае тэмпературу паверхні. У выпадку падземнага пажару яна нагрэецца куды больш за зямлю навокал, дзе агню няма. Вось за кошт гэтай розніцы і выяўляюцца ўзгаранні. Адсочваць пажары на тэрыторыі нашай краіны дапамагае пашыраная беларуска-расійская групоўка спадарожнікаў. Яна складаецца з шасці апаратаў, якія здольныя рабіць і перадаваць здымкі ў высокім разрозненні. Ачагі прывязваюцца да канкрэтных каардынат, каб і нашы падраздзяленні на месцах, і супрацоўнікі структур Мінлясгаса, і авіяцыя ведалі, куды трэба адпраўляцца.

...У той час, калі адбывалася наша гутарка, маніторы аператыўнай залы Цэнтра паказалі цеплавую анамалію непадалёк ад Бабруйска. Пазней паступіла інфармацыя пра тое, што там адбылося. Высветлілася, што ў адной з вёсак гарэла пуня. І вось такое кропкавае ўзгаранне было зарэгістравана з вышыні некалькіх соцень кіламетраў. Магчымасці ўражваюць!



— Пры гэтым мы можам арганізаваць відэаканферэнцсувязь і перадаваць відэа з месца надзвычайнай сітуацыі ў рэжыме рэальнага часу, — заўважае Аляксей Андрэенка. — Напрыклад, калі ў красавіку гэтага года паблізу нашых граніц у чарнобыльскай зоне на тэрыторыі Украіны бушаваў магутны пажар, то мы з нашай тэрыторыі маглі адсочваць змяненне яго плошчы і напрамак распаўсюджвання. Пры гэтым накладвалі, вядома, і звесткі са спадарожніка.

Назіранне з космасу можа выявіць не толькі пажар, але і небяспечныя гідралагічныя з'явы. У Цэнтр таксама сцякаюцца даныя сеткі назіранняў сейсмічнага і радыенукліднага маніторынгу. Аператары маюць аператыўны доступ да адпаведнай інфармацыі, каб самастойна аналізаваць штуршкі зямной паверхні і сітуацыю па радыенуклідах. Апошняе дазваляе вызначыць месца іх выкіду.

— Між іншым, калі адбываюцца пажары ў чарнобыльскай зоне на тэрыторыі Украіны, то адразу ж узнімаецца пытанне — ці не павысіўся праз гэта радыяцыйны фон? — згадвае спецыяліст. — Насамрэч, яго змяненні на нашай тэрыторыі калі і ёсць, то настолькі мікраскапічныя, што нават сучаснае абсталяванне не можа зафіксаваць падобнага павышэння. Пры гэтым мы разумеем, што людзі хочуць ведаць рэальную абстаноўку. Таму мы пастаянна перадаем усе атрыманыя звесткі з радыеэкалагічнага маніторынгу ў Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. А далей яны публікуюцца ў вольным доступе ў інтэрнэце.

Сярод задач Цэнтра — і апавяшчэнне насельніцтва пра ўзнікненне або пагрозу надзвычайнай сітуацыі. Адбываецца гэта праз усе магчымыя каналы сувязі. Дарэчы, да стварэння мабільнай праграмы «Дапамога побач», пра якую расказвала «Звязда», спецыялісты Цэнтра таксама прыклалі руку.

— У такім выпадку будзе запушчана аўтаматызаваная сістэма цэнтралізаванага апавяшчэння. Мы ўсе пачуем гук сірэн. Сігналы радыё і тэлебачання будуць перахоплены. На беларускіх каналах пойдзе бягучы радок, а праз аператараў сотавай сувязі пачнецца масавая рассылка SMS-паведамленняў.

І тады ж асноўная работа разгорнецца ў сэрцы Цэнтра — аператыўнай зале. У звычайным рэжыме там працуе дзяжурная змена, якая збірае і перадае ўсю інфармацыю па ліквідацыі надзвычайных сітуацый у краіне, у тым ліку і ва ўрад. Пры неабходнасці яна тут жа будзе ўзмоцнена. У зале таксама зарэзервавана некалькі рабочых месцаў — для камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Савеце Міністраў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ДЗЕ ПЕРШЫ РАЗ СПАЗНАЛА ШЧАСЦЕ...

### «Гэтая дзяўчына нарадзілася, каб прыехаць менавіта да нас...»

Яна працавала ў ЛНР дзевяць месяцаў. Потым напісала ліст па электроннай пошце ў Гомельскі медыцынскі ўніверсітэт. Адказалі даволі аператыўна: ёсць магчымасць прайсці інтэрнатуру ў Беларусі, нават на «бюджэце». Яна не верыла свайму шчасцю. Умовы беларускага боку былі — самастойна знайсці месца для замацавання ў якасці інтэрна і адпрацаваць абавязковыя два гады пасля заканчэння.

— Я адразу падумала пра Петрыкаў. Гэта радзіма маёй маці, тут жывуць яе сваякі. Ёсць стары дом, які застаўся ад бабулі. Хоць гэта маёмасць чужая, але была магчымасць пажыць пэўны час.

Рызыкаваць і пераязджаць у чужую старонку вырашылі разам — доктар і яе малады чалавек — Аляксандр, які пакінуў работу ў вугальнай шахце.

Прыехалі спачатку ў разведку. Шматпакутны інтэрн адразу скіравалася ў Петрыкаўскую райбальніцу, высветліла, ці ёсць магчымасць уладкавацца на работу.



— Мяне сустрэлі літаральна, як кажуць, з распасцёртымі абдымкамі. Спецыялістаў не хапала. Прапанавалі нават некалькі варыянтаў.

Месяцы інтэрнатуры, якія прайшла дзяўчына ў Луганску, не залічылі.

— У Луганску я была ўрачом сямейнай медыцыны — гэта як у Беларусі ўрач агульнай практыкі, — кажа цяпер ужо былы інтэрн Яна Сцепаненка, якая ў Петрыкаве абрала кардыялогію. — Усю інтэрнатуру прайшла тут жа. Нагоды ехаць у Гомель не было, бо існавала магчымасць усё прайсці на практыцы. Маё аддзяленне — тэрапеўтычнае, але з пэўнымі вузкімі кірункамі: кардыялагічныя хворыя, дыябетыкі, пацыенты з цэрэбраваскулярнымі і рэўматалагічнымі захворваннямі.

Урач шчыра прызнаецца: было ўражанне, што лёс нездарма прывёў яе ў гэты куток Палесся.

— Мне пашанцавала застаць «старую школу» ўсёй петрыкаўскай медыцыны. Мой хросны бацька ў спецыяльнасці, настаўнік па прафесіі Канстанцін Ісакавіч Лапета, тады загадчык аддзялення, вельмі цёпла прыняў у свой калектыў. Чалавек шчодры на веды — дзяліўся вопытам, рыхтаваў мяне да работы вельмі шчыра, нават натхнёна. Я ўдзячная, бо за час інтэрнатуры Канстанцін Ісакавіч зрабіў з мяне сапраўднага ўрача і ўвогуле дазволіў праверыць свае веды, сваю прыдатнасць як спецыяліста.

### «Прырастаеш не да месца, а да тых, хто побач...»

Калі прыехалі ў Петрыкаў, атрымалася, што Яна хутка знайшла работу, яе прынялі людзі і калектыў. Аляксандр, наадварот, сустрэўся з цяжкасцямі пасля пераезду. З юрыдычнага боку для Яны палёгкай сталі яе этнічна беларускія карані па маці.

А вось сужэнец доктара Яны — Аляксандр Бандарэнка, вопытны горнарабочы шахты імя Свярдлова ў Луганскай вобласці, — тут, у Петрыкаве, не мог працаўладкавацца. На работу не бралі нават па рабочай візе. Яна і Саша пажаніліся. Афармілі пасведчанне на права жыхарства, а пасля «спакусілі» перабрацца ў Петрыкаў са Свярдлоўска бацькоў Яны. Жылі разам з імі ў старым бабуліным доме.

— Спачатку быў смутак па родных месцах, але вельмі добра пераключала і нават выратоўвала тое, што мы ж абралі самае прыгожае месца: вакол такія мясціны — лес, прырода, няма калі сумаваць, — згадвае Яна, а ў размове міжволі ўсё ж такі домам называе родную Луганшчыну. — У Свярдлоўску засталася мая бабуля па бацьку. Ездзілі туды раз на паўгода. Спачатку нават меркавалі, што скончацца ваенныя дзеянні — і мы вернемся назад. Пасля хутка прызвычаіліся да добрага. Адчулі кантраст: у родных мясцінах, на жаль, бедна, брудна, няўтульна і, здаецца, няма ніякай перспектывы. На Беларусі — чыста, парадак паўсюль. Цяпер больш нікуды не збіраемся.

Аляксандр нечакана для сябе менавіта ў Петрыкаве знайшоў самае добрае месца работы.

— Выпадкова наш сваяк, які вучыўся ў Салігорску, прачытаў у мясцовай газеце, што для работы на Петрыкаўскі горна-абагачальны камбінат, які толькі пачыналі тады будаваць, шукаюць горных выратавальнікаў, — тлумачыць сямейная пара. — Саша паехаў на сумоўе — адразу ж прынялі на работу.

У рабоце ўчарашняга інтэрна Яны Сцепаненка таксама неспадзявана для яе адбыліся значныя перамены:

— Я не лічылася маладым спецыялістам, бо паводле закона прыехала толькі на інтэрнатуру. З аднаго боку, гэта пазбавіла мяне магчымых прывілеяў, але з другога, мяне як «немаладога інтэрна» адразу, як скончыла інтэрнатуру, назначылі загадчыкам паліклінікі, пасля і загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення.

### «Уходзіны...»

Аляксандр і Яна былі шчыра ўражаны, што, нягледзячы на сваё становішча перасяленцаў з пасведчаннем на права жыхарства, у Петрыкаве для іх не рабілі ніякіх абмежаванняў у плане сацыяльнай падтрымкі маладой сям'і.

— Нас паставілі ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Былі варыянты атрымаць нават сацыяльнае жыллё. Калі для работнікаў Петрыкаўскага ГАКа сталі будаваць новыя дамы — арэнднае жыллё — мы падалі свае дакументы.

Дзевяць месяцаў таму ў сям'і нарадзілася дачушка Марыя. Маладая маці атрымлівае дапамогу на дзіця і зноў прыемна дзівіцца, што магчыма такая падтрымка ад дзяржавы.

А не так даўно Яна, Аляксандр і маленькая Маша засяліліся ў новую кватэру. Атрымалі трохпакаёвую. Маладая маці жартуе — гэта на будучыню, каб яшчэ нарадзілі новых жыхароў Петрыкава.

Дарэчы, добра абжыліся ў новай мясціне і бацькі перспектыўнага кардыёлага, доктара Яны — Ірына Барысаўна і Вячаслаў Гарыевіч Сцепаненкі. Тры гады таму ў вёсцы Макарычы, што за шэсць кіламетраў ад Петрыкава, яны набылі праз аўкцыён стары сельскі Дом культуры. Спачатку ідэя здавалася на мяжы дзівацтва, але рызыкнулі. Памяшканне ў 240 «квадратаў» сваімі сіламі адрамантавалі, перавялі ў статус жылля. Цяпер робяць касметычны рамонт і рыхтуюцца ў хуткім часе адкрыць уласную аграсядзібу.

Дарэчы, адзначае сям'я Сцепаненка, іх поспеху з гэтым праектам у пэўнай ступені паспрыяла вельмі спагадлівая дапамога раённых службаў дзяржмаёмасці.

У маладой сям'і доктара і гарняка цяпер іншая мара — каб Аляксандр паступіў ва ўніверсітэт і далей будаваў кар'еру на камбінаце.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота з архіва гераіні.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЗАРАДЖАНЫЯ ЭМОЦЫЯМІ

## Моладзь — у цэнтры падзей

**Рэспубліканскі маладзёжны цягнік «#Беларусь. Моладзь. Натхненне», які стартаваў тыдзень таму ў Віцебску, прыбыў на станцыю Мінск-Пасажырскі. Яго ўдзельнікі — актывісты БРСМ — правялі ўрачыстую цырымонію ўскладання кветак да стэлы «Мінск — горад-герой», арганізавалі экскурсію па музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а па завяршэнні ў зале музея адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння сертыфікатаў усім удзельнікам.**

Праект Міністэрства адукацыі, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і Беларускай чыгункі аб'яднаў каля 90 хлопцаў і дзяўчат ад 18 да 31 года з розных рэгіёнаў — таленавітых навучэнцаў, студэнтаў, маладых навукоўцаў, пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных прадметных алімпіяд, стыпендыятаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта, спартсменаў, рабочую і сельскую моладзь, удзельнікаў студатрадаўскага руху, валанцёраў. Усяго за тыдзень на аздобленым сімволікай праекта чыгуначным саставе маладыя хлопцы і дзяўчаты праехалі ўсе абласныя гарады і некалькі раённых цэнтраў па маршруце Віцебск — Шклоў — Магілёў — Гомель — Пінск — Брэст — Гродна — Маладзечна — Мінск. Агульная працягласць склала 1413 кіламетраў.

У кожным з пунктаў прыбыцця моладзь правяла сустрэчы з кіраўніцтвам аблвыканкамаў і райвыканкамаў, адкрытыя дыялогі з кіраўнікамі арганізацый, дэпутатамі, лідарамі грамадскіх арганізацый, наведала мемарыяльныя комплексы і знакавыя аб'екты, сустрэлася з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і працы. Актывісты ўсклалі кветкі да мемарыяльных комплексаў «Буйніцкае поле», «Ала», «Вызваліцелям Пінска», «Брэсцкая крэпасць-герой», да мемарыяльнага комплексу ў гонар вызваліцеляў Маладзечна і да манумента Перамогі ў Мінску. А таксама яны ўдзельнічалі ў дабрачынных і працоўных акцыях, розных трэнінгах, майстар-класах, музычна-патрыятычных канцэртах і спартыўных спаборніцтвах.

**Кіраўнік цягніка дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Сяргей СЫРАНКОЎ** упэўнены, што такі праект спрыяе развіццю і рэалізацыі грамадска значных ініцыятыў, папулярызацыі маладзёжнага руху краіны, аб'яднанню намаганняў моладзі для рэалізацыі сацыяльна значнай дзейнасці, а таксама падтрымцы таленавітай і адоранай моладзі. «Мы лічым, што тая энергія, якой мы зарадзіліся, наведваючы рэгіёны, размаўляючы з кіраўніцтвам рэгіёнаў, з найлепшымі прадстаўнікамі маладзёжнага асяроддзя, працоўнымі калектывамі, грамадскімі арганізацыямі, — гэты драйв мы пранеслі па ўсёй краіне. Упэўнены, што гэта стане чарговым крокам да далейшай кансалідацыі маладзёжнага асяроддзя».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ДЭКРЭТНЫЯ ВЫПЛАТЫ ПАДРАСТУЦЬ З 1 ЖНІЎНЯ

**Памер дапамогі на догляд дзяцей ва ўзросце да трох гадоў павялічыца на 5,5 %. З 1 жніўня матулі ў дэкрэце будуць атрымліваць 427,84 рубля на першага малога, 488,96 рубля — на другога і наступнага малых і 550,08 рубля — на дзіця-інваліда.**

Пералік сум робіцца двойчы на год у лютым і жніўні адпаведна з законам «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Гэта адбываецца ў сувязі з ростам сярэднямесячнай заработнай платы ў гэтыя ж перыяды, нагадалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Памер дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да трох гадоў вызначаецца наступным чынам:

за студзень бягучага года — зыходзячы з сярэднямесячнай зарплаты ў краіне за другі квартал папярэдняга года;

за перыяд з 1 лютага да 31 ліпеня 2020-га — зыходзячы з сярэднямесячнай зарплаты ў краіне за чацвёрты квартал 2019 года;

за час з 1 жніўня да 31 снежня гэтага года — зыходзячы з сярэднямесячнай зарплаты ў краіне за другі квартал.

Такім чынам, памер дапамогі на першае дзіця складае 35 % ад зарплаты работнікаў Беларусі за квартал. На другога і наступных малых — 40 %. Нарэшце, на дзіця-інваліда, незалежна ад таго, якім па чарзе яно нарадзілася ў сям'і, — 45 %.

Дакладна падлічыць суму можна, зыходзячы з памеру намінальнага заробку, які налічаны работнікам у краіне ў другім квартале сёлета. Гэтая лічба — 1222,40 рубля — прадстаўлена Нацыянальным статыстычным камітэтам і ў параўнанні з чацвёртым кварталам мінулага года вырасла на 5,5 %.

**Ірына СІДАРОК.**

# Сем дзён, каб вызначыцца з прафесіяй

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы абітурыентам прапануюцца чатыры новыя спецыяльнасці: «Штучны інтэлект», «Прамысловыя робаты і робататэхнічныя комплексы ў машынабудаванні», «Дызайн віртуальнага асяроддзя» і «Спартыўна-педагагічная дзейнасць».

Прыёмныя камісіі будуць прымаць дакументы **з 25 да 31 ліпеня.** У нядзелю, 26 ліпеня, яны таксама будуць працаваць. У гэтыя тэрміны вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Папярэдне падаць дакументы ў прыёмную камісію можна анлайн праз асабісты кабінет абітурыента на сайце абранай ВНУ: для гэтага патрабуецца запоўніць форму з неабходнымі звесткамі і прыкласці копіі шэрагу папер. Пасля апрацоўкі дакументаў абітурыент зможа выбраць дзень і час у электроннай чарзе, каб наведаць прыёмную камісію асабіста. Але гэты этап пастараюцца максімальна скараціць, каб пазбегнуць вялікай колькасці людзей у адным месцы.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымацца:

**з 25 ліпеня да 10 жніўня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 25 ліпеня да 13 жніўня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**з 25 ліпеня да 15 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання сумоўя, — **з 25 да 27 ліпеня.**

### Уступныя выпрабаванні пройдуць у наступныя тэрміны:

**з 1 да 3 жніўня** — ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, Ваеннай акадэміі і на ваенных факультэтах ВНУ;

**з 1 да 7 жніўня** — у іншых ВНУ.

У ВНУ сельскагаспадарчага профілю на завочнай форме атрымання адукацыі — **з 6 да 15 снежня.**

Паколькі на падачу дакументаў на «бюджэт» даецца ўсяго сем дзён, абітурыентам трэба загадзя выбудаваць дакладную стратэгію дзеянняў. Адразу варта вызначыцца з профілем (магчыма, гэта будуць дзве-тры спецыяльнасці) і ўстановай адукацыі, куды хочацца паступіць. Падаваць дакументы лепш у першыя дні, бо калі ахвотных цягнуць да апошняга акажацца шмат, то конкурсная сітуацыя можа рэзка змяніцца ўжо пасля закрыцця прыёмнай камісіі, і абітурыент мае ўсе шанцы застацца за бортам. А вось сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна: інфармацыя аб ходзе падачы дакументаў абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а ў некаторых універсітэтах — у рэжыме рэальнага часу.

У многіх ВНУ конкурс праводзіцца па групе спецыяльнасцяў з адзіным наборам уступных экзаменаў, што дазваляе абітурыентам адчуваць сябе больш спакойна.

Сярод новаўвядзенняў гэтага года варта адзначыць правядзенне ўнутраных уступных выпрабаванняў для выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія паступаюць на скарочаную форму навучання, па адзіных праграмах ва ўсіх ВНУ. Таксама сёлета выпускнікі профільных аграрных класаў атрымалі права паступаць на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці без уступных выпрабаванняў, але на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі і пры наяўнасці ў атэстаце адзнак па профільных прадметах, не ніжэйшых за 7 балаў. У зацверджаным пераліку 18 спецыяльнасцяў: «Агранамія», «Плодаагародніцтва», «Аграхімія і глебазнаўства», «Ветэрынарная медыцына», «Прамысловае рыбаводства», «Тэхнічнае забеспячэнне меліярацыйных і водагаспадарчых работ», «Энергетычнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі» і іншыя.

Яшчэ адзін шанц, якім абітурыенты могуць скарыстацца, — гэта дадатковы набор на бюджэтныя месцы, што засталіся вакантнымі. На іх змогуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ.

Ваенная акадэмія, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, Інстытут пагранічнай службы і ваенныя факультэты павінны праінфармаваць абітурыентаў аб наяўнасці вакантных месцаў да 6 жніўня, астатнія дзяржаўныя ВНУ — да 12 жніўня.

### Тэрміны залічэння абітурыентаў на спецыяльнасці, па якіх не здаюцца ўступныя выпрабаванні на бюджэтную форму:

**да 4 жніўня** — у Ваенную акадэмію, Інстытут пагранічнай службы, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і на ваенныя факультэты;

**да 6 жніўня** — у іншыя дзяржаўныя ВНУ (акрамя завочнай формы атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю);

**да 20 снежня** — на завочную форму атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю.

### На спецыяльнасці, па якіх здаюцца ўступныя выпрабаванні:

**з 10 да 11 жніўня** — у дзяржаўныя ўстановы вышэйшай адукацыі;

**да 5 жніўня** — на ваенныя факультэты ВНУ;

**да 20 снежня** — на завочную форму атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю.

**Тэрміны залічэння на вакантныя бюджэтныя месцы** ў Інстытут пагранічнай службы і Універсітэт грамадзянскай абароны МНС — да 8 жніўня, у іншыя ВНУ — да 14 жніўня.

**Абітурыенты, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі на платнай аснове, будуць залічвацца да 17 жніўня.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кінакрокі

## Канстанцін ВАРАБЕЙ:

# «Для развіцця рынку трэба падтрымліваць як мага большую колькасць гульцоў»

**СКАНДАЛ вакол апошніх спроб Міністэрства культуры размеркаваць грошы на кінапраекты паказаў, што сістэма фінансавання сферы, хоць мы гэта ведалі і раней, мае хібы. Пара скаргаў — і экранізацый кніг «Радзіва «Прудок» Андруся Горвата і «Сфагнум» Віктара Марціновіча ўжо не будзе. Нагадаю, пасля падвядзення вынікаў апошніх тэндараў дзяржзакупкі, праз якія кінапраекты атрымліваюць ад Міністэрства культуры бюджэтныя грошы, некаторыя ўдзельнікі конкурсу, што не перамаглі ў тэндарах, напісалі скаргі ў МАРГ. У адказ Міністэрства культуры раптам адмяніла закупку двух праектаў — якраз экранізацый, што выклікала расчараванне і бурныя абмеркаванні ў кінасупольцы. Між іншым, упершыню ўсе выдзеленыя грошы былі размеркаваныя паміж прыватнымі кінакампаніямі, але і гэты блін аказаўся камяком. Тым часам даволі даўно гаворыцца аб праекце ўказа Прэзідэнта аб стымуляванні кінематаграфіі, які б стварыў належныя ўмовы для развіцця не толькі «Беларусьфільма», але і беларускага кіно ў цэлым, — першы варыянт быў распрацаваны ў Міністэрстве культуры і прапанаваны ў 2017 годзе, але кінасуполка запатрабавала спыніць працэс і дапрацаваць праект з улікам пажаданняў незалежных кінагульцоў. Ініцыятарам дыялогу выступіў у тым ліку прадзюсар і кіраўнік Майстэрні сацыяльнага кіно Канстанцін Варабей. З таго моманту ён пастаянна знаходзіцца ў кантакце з Міністэрствам культуры і спрабуе ад імя Гільдыі прадзюсараў і кінавытворцаў прасунуць неабходныя для сферы кіно перамены. У нашым з Канстанцінам інтэрв'ю мы спрабуем разабраць, якія, уласна, перамены патрэбны айчыннай кінаіндустрыі.**

***— Фінансаванне кіно ў нас адбываецца праз тэндары дзяржзакупак — наколькі гэтая сістэма цяжкаважная ў параўнанні з практыкамі іншых краін і ці сустракаў ты падобнае за мяжой?***

— Ва Украіне гэта, здаецца, называецца гэтаксама, але мае асаблівы парадак, у нас жа закупка кіно прыраўнавана да любой іншай закупкі. Гэтая сістэма цікавая тым, што выключае магчымасць замяніць дакументы ці нешта дадаць пасля дэдлайну, то-бок ніхто не можа ўмяшацца ў працэс, але яна ўсё яшчэ не вельмі прыдатная да кіно. Як паказвае практыка, МАРГ можа ўвесці асаблівы парадак закупкі, як зрабіў гэта для аўдытарскіх паслуг. Для творчага сектара таксама варта было б зрабіць выключэнне, і ініцыятыва, хутчэй за ўсё, павінна ісці ад Міністэрства культуры, але ў цэлым нам трэба грунтоўна рэфармаваць конкурс, касметычна не атрымаецца. Самае цікавае, Мінкульт гэтае пытанне ўжо разглядае.

> **«Рыбэйт сёння як рэкламная акцыя: «Там 25 працэнтаў, там 30, а мы дамо 35». Тое, што ў Беларусі нуль, затое цэны меншыя, гучыць непераканаўча».**

***— Давай разбяром, якія змены патрэбныя практыцы фінансавання кіно.***

— Мы прапануем перайсці на грантавую сістэму і сфармуляваць выразныя крытэрыі фарміравання камісіі і ацэнкі праектаў. Тут не трэба нічога прыдумляць, дастаткова ў Google Translate перакласці палажэнне аб кіно на Украіне, Польшчы ці Літве ды адаптаваць яго пад нашыя ўмовы. Я б арыентаваўся на Украіну, дзе таксама прадузята ставяцца да дзяржаўных конкурсаў і аб празрыстасці клапоцяцца асобна. Каб сфарміраваць камісію, іх дзяржінстытуцыі, асацыяцыі і гільдыі вылучаюць людзей, прозвішчы кандыдатаў змяшчаюцца ў барабан і выбіраюцца выпадкова. Наша камісія асаблівая не мяняецца ўжо некалькі гадоў, а нават калі ўзяць кінакрытыкаў, яны могуць быць прадузятымі да пэўных рэжысёраў і аддаваць перавагу любімчыкам, адпаведна шанцаў могуць быць пазбаўлены нават праекты з добрым патэнцыялам. Калі б тэндар на дэбютны фільм аб'явілі зноў, ды з ранейшай камісіяй, мне здаецца, ён бы папросту не адбыўся: ацэнкі гэтага журы вядомыя, няма сэнсу падаваць другі раз. Затое новая камісія стварыла б канкурэнтныя ўмовы, а магчымая другая перамога «Першай КінаВідэаКампаніі» зняла б усе пытанні.

***— У чым перавага грантавай сістэмы?***

— Яна больш гнуткая, дазваляе пітчынгі, што забяспечылі б адкрытасць працэсу і выключылі цэнзуру, тут можна арганізоўваць прамыя трансляцыі пасяджэнняў камісіі. У ёй няма такога крытэрыю ацэнкі, як кошт фільма. Гэта не значыць, што можна даць пяць мільёнаў у адны рукі і забыць, — выдаткі кантралюе сістэма аўдыту: фарміруюцца верхняя і ніжняя планка бюджэту, кампанія заяўляе, колькі грошай ёй трэба, але ў донара застаецца права рэгуляваць каштарыс. Аўдытары могуць задаць пытанне, чаму тэхніка каштуе ў два разы больш, чым у іншым праекце, і калі заяўнік не здольны гэта абгрунтаваць, бюджэт змяншаецца. У нас жа былі выпадкі, калі праекты папросту здымаліся з конкурсу праз памылкі ў каштарысе.

***— Што варта змяніць у крытэрыях ацэнкі праектаў?***

— Іх неабходна дэталізаваць і зрабіць зразумелымі, каб было менш магчымасцяў для маніпуляцый. У фондзе Eurimages дадатковыя балы можна атрымаць за партфоліа мастака-пастаноўшчыка альбо аператара, за капрадукцыю, бо гэта значыць большы рынак, за рэалізацыю жанчыны ў якасці рэжысёра і гэтак далей. Наш конкурс, напрыклад, патрабуе планы фестывальнага прасоўвання і акупнасці, але гэтага, што дзіўна, няма ў крытэрыях ацэнкі. Апошнія тэндары выявілі яшчэ адно пытанне: усе хацелі прыбраць «Беларусьфільм», і ніхто не задумваўся, што яго месца можа заняць іншая кампанія. Тут не ідзе гаворка пра манаполію — «Першая КінаВідэаКампанія» ўсё ж не выйграла ўсе лоты, але для развіцця рынку трэба падтрымліваць як мага большую колькасць гульцоў. Нам бы дапамагла ўкраінская практыка, калі з заяўнікаў фарміруецца рэйтынг і Дзяржкіно кажа: «У нас ёсць пяць мільёнаў, першы просіць мільён, застаецца чатыры, даём другому месцу паўмільёна, застаецца тры з паловай», — і гэтак далей. Такая сістэма спраціла б жыццё Мінкульту, бо пасля адмены закупак яму замест абвяшчэння новага тэндара можна было б проста размеркаваць грошы паміж другім і трэцім месцамі. Такіх асноўных палажэнняў хапіла б, каб узнавіць цікавасць да конкурсу.

> **«Я б арыентаваўся на Украіну, дзе таксама прадузята ставяцца да дзяржаўных конкурсаў і аб празрыстасці клапоцяцца асобна».**

***— Як удзельніка конкурсу цябе не абмяжоўваюць загадзя сфармуляваныя тэмы патэнцыйных фільмаў?***

— Я супраць тэм, Гільдыя выступае за раздзяленне прадукту на камерцыйнае кіно і аўтарскае, як бы хто ні казаў, што гэта немагчыма. Тэмы на апошніх тэндарах былі сфармуляваныя больш шырока, чым раней, але найбольш паспяховым усё роўна стаў лот проста на дэбют. Паводле досведу, калі называецца падрабязная тэма, узнікае разуменне, што яна сфармуляваная пад некага. Я за тое, каб раздзяляць кіно па мэтавай аўдыторыі: абвяшчаць лоты на дэбют альбо дзіцячы фільм — нармальна, але тэма «Сацыяльна-эканамічныя дасягненні Рэспублікі Беларусь» выклікае некаторы скепсіс. Я так разумею, адмовіцца ад гэтага мінкульт не можа, бо іх патрабуе працэдура дзяржзакупкі.

***— Адной з прапаноў Гільдыі з'яўляецца стварэнне асобнай кінаінстытуцыі.***

— У большасці краін фінансаванне кіно адбываецца апасродкавана праз адмысловы інстытут, як Дзяржкіно ва Украіне, PISF у Польшчы альбо Літоўскі кінацэнтр, — такія структуры падыходзяць да кіно комплексна, бо дзяржпадтрымка прадугледжвае не толькі выдзяленне грошай, але і стварэнне ўмоў для здымак у краіне, удзел у кінарынках, прасоўванне брэнда нацыянальнага кіно. Было б прасцей і эфектыўней, калі б за гэта адказвала адна структура — Фонд кіно альбо Інстытут кіно, называцца яна можа як заўгодна, — а не тры чалавекі ў Мінкульце, што фізічна не могуць выканаць такі аб'ём работ. Можа быць, гэта непапулярная мера, але часткова яе можна фінансаваць за кошт пракату замежных фільмаў — такая практыка існуе ў шэрагу краін, гэты крок павінен знайсці разуменне з боку замежных дыстрыб'ютараў. Мы прыкладна падлічылі, што нават некалькі працэнтаў ад пракату прынясуць прыкладна той самы бюджэт, які сёння на кіно мае Міністэрства культуры. Фонд кіно мог бы лягчэй, чым праз працэдуру дзяржзакупкі, размяркоўваць грошы ў тым ліку на фестывалі, адукацыю ці кінарынкі.

***— Што цяпер адбываецца з праектам указа Прэзідэнта?***

— Мінкульт не кінуў гэтую ідэю — уласна прыняцця законапраекта хочуць і Міністэрства, і кінасуполка, і «Беларусьфільм». Мы б'ёмся за указ, бо ён можа перабіць усе нарматыўныя акты, што перашкаджаюць кіно развівацца, і адначасова вырашыць пытанні і фінансавання, і рыбэйту, і здымак у горадзе. Складанасць заключаецца ў тым, каб вырашыць, што ў ім павінна быць закранута, і дакладна гэта сфармуляваць.

***— Наколькі кінасуполка ўцягнута ў працэс распрацоўкі ўказа?***

— На гэты момант слаба: адбываюцца разавыя сустрэчы з Мінкультам і ёсць згода аб стварэнні савета па кінематаграфіі, куды ўвойдуць прадстаўнікі Гільдыі прадзюсараў і кінавытворцаў. Трэба вызначыць, як гэта будзе працаваць, бо без платформы прапаноў, базісу, з якім пагодзіцца большасць, усё ператвараецца ў канфлікт паміж старым і новым пакаленнямі, тымі, хто накіраваны на еўрапейскі рынак, і тымі, хто накіраваны на расійскі рынак. Нам відавочна не хапае практыкі аб'яднання: кажуць, сектар НДА ў Беларусі не развіты ў цэлым, але ў кінасуполцы сітуацыя яшчэ горшая, людзі папросту не прызвычаіліся аб'ядноўвацца і не разумеюць, навошта асацыяцыі і гільдыі патрэбны, хоць гэта зразумела, бо Саюз кінематаграфістаў і Гільдыя кінаакцёраў не выконваюць свае функцыі. Крызіс з апошнімі тэндарамі таксама з гэтым звязаны: на адзін конкурс былі вынесены сістэмныя пытанні, хоць праблемы існавалі заўсёды і механізм іх вырашэння іншы. Я не веру, што пасля скаргаў у МАРГ штосьці памяняецца, таму конкурс або будзе абвешчаны па старых правілах, або не будзе абвешчаны ўвогуле.

> **«Апошнія тэндары выявілі яшчэ адно пытанне: усе хацелі прыбраць «Беларусьфільм», і ніхто не задумваўся, што яго месца можа заняць іншая кампанія».**

***— Як ты думаеш, ці магло міністэрства ў адказ на скаргі ў МАРГ зрабіць інакш і не адмяняць адным махам дзве закупкі?***

— Учынак Мінкульта дзіўны: можна было дачакацца вынікаў праверкі, а ўрэшце аказалася, што МАРГ нават не палічыў скаргі абгрунтаванымі, значыць, імёны пераможцаў маглі б захавацца. Растлумачыць рашэнне міністэрства можна простым «псіханулі», альбо, магчыма, яно не хацела развіваць канфлікт. Усё ж на апошніх тэндарах нешта змянілася: Мінкульт назваў больш шырокія тэмы, з чым звязана вялікая колькасць заявак, прынамсі, вялікая для Беларусі: ва ўкраінскае Дзяржкіно сёлета пададзена 447 ігравых і дакументальных праектаў, з дванаццаццю гэта не параўнаць. Да таго ж амаль усе ўдзельнікі ведалі, што «Беларусьфільм» не будзе падавацца:



па тым, наколькі гэты фактар аказаўся важным, відаць давер да конкурсу. Насамрэч, калі адна-дзве скаргі могуць ануляваць вынікі тэндараў, гэта паказвае на пэўную праблему. Сёння Bez Buslou Arts паскардзіцца на «Першую КінаВідэаКампанію», а заўтра «Першая КінаВідэаКампанія» можа сарваць конкурс, у якім перамагла Bez Buslou Arts, — умовы трэба мяняць, інакш гэтыя валтузня і барацьба працягнуцца.

***— Здавалася б, калі ў прыватных кінакампаній мала шанцаў атрымаць дзяржаўныя грошы, яны маглі б адшукаць сродкі фінансавання за мяжой, але, аказваецца, для гэтага таксама патрэбны дзеянні Мінкульта. Што міністэрства магло б зрабіць?***

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 25 июля 2020г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 5 августа 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 02.06.2020 г. № 105 (29219). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

И З В Е Щ Е Н И Е ( И Н Ф О Р М А Ц И Я ) О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 21 августа 2020 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 286-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – учреждение «Национальный художественный музей Республики Беларусь»**, тел.: +375 (17) 328 68 44 – приемная; +375 (17) 327 79 12 | | | | | | | |
| 1 | **г. Минск, ул. К. Маркса, 24** | 349,0, в т. ч. 110,76 – подвал; 191,74 – 1-й этаж; 46,5 – кафе-бар на 1-м этаже | 2,0 – 3 года; 3,0 – последующий период | 1 474,53 | Под объект общественного питания | 147,40 | Помещения в подвале и на 1-м этаже здания, которое является материальной историко-культурной ценностью категории «3». Здание не функционирует, находится в стадии реставрации в составе объекта «Реставрация и приспособление единого комплекса зданий Национального художественного музея Республики Беларусь». После ввода кафе в эксплуатацию и получения технического паспорта на кафе площадь будет уточнена в установленном порядке. **Срок аренды – 10 лет с момента ввода кафе в эксплуатацию и получения технического паспорта на кафе** (1*) |

*1* Работы по финишной отделке (помещения №№ 110–115, 117, 119–121), закупка необходимого технологического оборудования, мебели, сантехнической «посуды», кухонного оборудования и установка охранной сигнализации осуществляются на основании разработанной арендатором проектно-сметной документации за счет собственных средств арендатора без последующей компенсации затрат. Арендатор возмещает затраты арендодателю по корректировке проектно-сметной документации по помещениям кафе (финишная отделка (помещения №№ 110–115, 117, 119–121), технологическое оборудование, сантехническая «посуда», мебель, кухонное оборудование, охранная сигнализация).*

*Срок завершения строительно-монтажных работ и ввод в эксплуатацию кафе – в течение 2 месяцев с момента ввода в эксплуатацию и получения технического паспорта здания по ул. К. Маркса, 24.*

*Необходимо также соблюсти следующие условия:*

*1. Разработать дизайн-проект кафе и согласовать его с администрацией музея;*
*2. Требуемое название – ArtMuseumCafe;*
*3. Современная национальная кухня (новое разработанное меню);*
*4. Форма одежды – дизайн рабочей формы сотрудников кафе согласовывается с администрацией музея с обязательным размещением музейного логотипа и в корпоративном цвете;*
*5. Требование к персоналу – владение 3 языками: белорусским, русским, английским;*
*6. Режим работы арт-кафе – с 11.00 до 24.00.*

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. + 375 (17) 327 40 22.

Аукцион состоится **21 августа 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 23 июля 2020 г. по 17 августа 2020 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

К участию в аукционе допускаются юридические или физическое лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников аукциона с указанием порядковых номеров, под которым данные лица зарегистрированы.

**При этом лицо, желающее принять участие в аукционе:**

- *уплачивает задаток по соответствующему предмету аукциона на текущий (расчетный) банковский счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО »Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 190398583, получатель платежа – государственное предприятие «МГЦН», назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 286 от 21.08.2020 по предмету аукциона № __;*

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе (бланк заявления можно получить у организатора аукциона) с приложением следующих документов:

*юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

*юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:*

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

*индивидуальный предприниматель:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

*физическое лицо* – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение, бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность, а представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Порядок определения победителя аукциона:**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион по каждому предмету аукциона начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):

- подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;
- в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;
- в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);
- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

- возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;
- организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;
- юридические лица и индивидуальные предприниматели производят оплату задатка исключительно платежным поручением;
- при отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;
- организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона, засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);
- договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом); заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается;
- базовая арендная величина (БАВ) с 01.04.2019 до 30.09.2020 составляет 16,90 рублей.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – + 375 (17) 327 40 22, бухгалтерия – + 375 (17) 328 36 58, отдел аренды – + 375 (17) 327 47 29.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы на право аренды помещений»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

K@нтыненты

# Справа на трыльёны еўра



## Чым адметны ліпеньскі саміт ЕС?

**Першы пасля доўгага перапынку з прычыны пандэміі каранавіруса «афлайнавы» саміт Еўрасаюза, які адбыўся ў Брусэлі, дакладна ўвайшоў у гісторыю. Прынамсі, так яго ахарактарызаваў прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон. Нарада ў вярхах пачалася ў пятніцу раніцай, працягвалася ў суботу, рабочая нядзеля доўжылася да раніцы панядзелка, а потым перагаворы аднавіліся ў той жа дзень увечары. Усяго трыццаць хвілін не хапіла лідарам еўрапейскіх краін, каб пабіць рэкорд саміту-2000 у Ніцы. Тады абмяркоўвалася прынцыповае пытанне — аб змяненні заканадаўства ЕС напярэдадні прыёму ў Еўрасаюз 10 новых краін-членаў. Фактычна старая Еўропа вырашала, ці патрэбна ёй Еўропа новая, посткамуністычная. Брусельскі саміт у ліпені 2020-га па сваім парадку не выглядаў гэтак жа лёсавызначальна, але насамрэч перамены, якія ён абяцае ЕС, могуць у доўгатэрміновай перспектыве стаць такімі ж уражальнымі. Аб чым жа дамовіліся прэзідэнты і прэм'еры?**

### Ашчадная пяцёрка

Арганізатары ліпеньскага надзвычайнага саміту Еўрасаюза зрабілі ўсё для таго, каб абараніць здароўе кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў 27 краін, якія зляцеліся ў Брусель. Строгі рэгламент нашэння масак (на пленарных пасяджэннях і тым больш падчас індывідуальных зносін у перапынках на каву-брэйк), забарона рукапацісканняў, скарачэнне дэлегацый амаль утрая, беспярапынная дэзынфекцыя памяшканняў палаца «Еўропа». Кожнаму з удзельнікаў, нягледзячы на высокі статус, кіраўнік Еўрасавета Шарль Мішэль загадаў выконваць сацыяльную дыстанцыю ў 1,5 метра. Кандыцыянеры як патэнцыйныя разносчыкі інфекцыі ў цэнтральнай зале «Еўропы» на час пленарных выступленняў былі адключаны. У залу, якая разлічана на 330 чалавек, дазволілі ўваход толькі 31 удзельніку.

«Гэта момант ісціны для Еўропы. Мы перажываем беспрэцэдэнтны крызіс аховы здароўя, а таксама эканамічны і сацыяльны крызіс, яны патрабуюць значна большай салідарнасці і амбіцый», — адазваўся аб саміце прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон, адпраўляючыся ў Брусель. «Справа не толькі ў фінансавых аб'ёмах або фінансавых пазіцыях. Мы рыхтуем эканамічны і сацыяльны адказ усім нашым еўрапейскім грамадзянам», — заявіў, у сваю чаргу, прэм'ер Італіі Джузэпэ Контэ.

Яшчэ да пачатку саміту было зразумела, што ён будзе няпросты. У Еўрасаюзе склаліся некалькі супрацьлеглых лабісцкіх груп, і кожная змагаецца за свае ідэі. Розныя падыходы і інтарэсы 27 дзяржаў ЕС у тым, што датычыцца фінансавых прапаноў па антыкрызісным аднаўленні, падзялілі ўдзельнікаў сустрэчы на «поўнач», «поўдзень» і «ўсход». Галоўным нязгодным аказаўся прэм'ер-міністр Нідэрландаў Марк Рутэ. На яго нават скардзіўся кіраўнік урада Венгрыі Віктар Орбан. «Я не люблю шукаць вінаватага, але гэты галандзец — сапраўдны адказны за хаос», — цытавала агенцтва Reuters венгерскага прэм'ера. Пра ўпартасць Рутэ ў адстойванні сваёй пазіцыі паведамляў на сваёй старонцы ў Facebook і Джузэпэ Контэ. Яшчэ ў мінулую суботу ён заявіў, што краіны павінны прыйсці да пагаднення ў нядзелю, паколькі зацягванне перагавораў нікому не выгадна. Але ж і нядзельныя спробы дамовіцца не мелі плёну.

«Мы пачынаем трэці дзень перагавораў, і ён, напэўна, будзе вырашальным», — казала ў нядзелю канцлер Германіі Ангела Меркель. Але ў ноч на панядзелак страсці яшчэ больш напаліліся. Еўрапейскія СМІ паведамлялі, што прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон так выйшаў з сябе, што нават ударыў кулаком па стале. Прычына ўсё тая ж — нежаданне Нідэрландаў, Швецыі, Даніі і Аўстрыі падпісваць план аднаўлення еўрапейскай эканомікі. Больш за тое, да групы гэтых краін, якая была названая «ашчаднай чацвёркай» (яны катэгарычна выступалі супраць грашовых «падарункаў» і патрабавалі зрэзаць прапанаваны пакет дапамогі амаль удвая), далучылася яшчэ адна — Фінляндыя. Такім чынам пазіцыя нязгодных у ходзе перагавораў нават умацавалася, а шанцы зацвердзіць каштарыс антыкрызісных выдаткаў панізіліся. Справа ў тым, што дакументы на саміце ЕС лічацца зацверджанымі не простай большасцю галасоў і не дзвюма трацінамі, а толькі пры ўмове аднагалоснага адабрэння.

Краіны-донары з «ашчаднай пяцёркі» выступілі супраць планаў Брусэля выдзеліць найбольш пацярпелым ад пандэміі краінам 500 мільярдаў еўра з агульнага пакета аб'ёмам 750 мільярдаў на аснове бязвыплатнай субсідыі. Яны патрабавалі строгага кантролю над тым, як дзяржавы — рэцыпіенты дапамогі будуць яе выкарыстоўваць. Прэм'ер-міністр Нідэрландаў настойваў нават на праве вета па нацыянальных праграмах аднаўлення эканомікі.



Гэтаму катэгарычна пярэчылі асабліва пацярпелыя ад каранакрызісу Італія і Іспанія. «Такое вета недапушчальнае як з юрыдычнага, так і з палітычнага пункту гледжання», — адрэагаваў кіраўнік урада Італіі Джузэпэ Контэ. Прэм'ер-міністр Швецыі Стэфан Лёвен раней заяўляў, што для пагаднення па галоўным еўрадакуменце неабходна многае змяніць. «Мы па-ранейшаму дастаткова далёкія адно ад аднаго», — заўважаў шведскі прэм'ер, маючы на ўвазе зусім не антыкавідную дыстанцыю. Вырашальным днём стаў панядзелак, 20 ліпеня.



### «Зялёнае» аднаўленне

Пасля перагаворнага марафону, які доўжыўся амаль 90 гадзін, кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў 27 краін ЕС дасягнулі пагаднення па бюджэце супольнасці на 2021—2027 гады аб'ёмам 1 трыльён 74,3 мільярда еўра і фондзе аднаўлення эканомікі пасля пандэміі каранавіруса ў памеры 750 мільярдаў. Такім чынам, на працягу сямі наступных гадоў Еўрасаюз атрымае сумарныя фонды ў 1,824 трыльёна еўра, што амаль удвая перавышае бюджэт перыяду 2014—2020 гадоў.

Як заявіў на прэс-канферэнцыі Шарль Мішэль, упершыню ў гісторыі Еўрасаюза шматгадовы бюджэт супольнасці прывязаны да кліматычных задач. «Дасягнутае пагадненне — гэта нашмат больш, чым грошы. Гэта рабочыя месцы, здароўе і дабрабыт еўрапейцаў», — дадаў ён. Кіраўнік Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен адзначыла, што «аднаўленне ЕС будзе «зялёным». «Бюджэт пакрые «зялёную здзелку». Мы інвестуем у будучыню Еўрасаюза. У Еўропы зараз ёсць шанц выйсці з крызісу мацнейшай», — адзначыла яна.

750-мільярдны пазабюджэтны фонд аднаўлення эканомікі атрымаў назву «ЕС новага пакалення». Гэтыя сродкі Еўракамісія мяркуе прыцягнуць у выглядзе крэдытаў, атрыманне якіх павінна быць цалкам завершана да канца 2026 года. Тэрміны пагашэння ўсёй сумы разлічаны на перыяд да 31 снежня 2058-га. Абавязковая ўмова пры асваенні сродкаў з гэтага фонду — не менш за 30 % ад усіх прадстаўленых кожнай з краін супольнасці субсідый і крэдытаў павінны ісці на «пазітыўныя кліматычныя праекты». Яны накіраваны на ўкараненне «зялёных» тэхналогій, альтэрнатыўнай энергетыкі, энергазберажэння — усяго, што будзе спрыяць выкананню задачы Еўракамісіі па будаўніцтве да 2050 года ў ЕС эканомікі з нулявымі вугляроднымі выкідамі.

З гэтых грошай паміж краінамі ЕС 390 мільярдаў еўра могуць быць размеркаваны ў выглядзе грантаў (бязвыплатная дапамога), 360 мільярдаў — у выглядзе льготных крэдытаў. Праекты для фінансавання ў рамках гэтага фонду павінны зацвярджацца Еўракамісіяй і Саветам ЕС. Грошы, якія выдзяляюцца ў выглядзе грантаў, павінны быць цалкам размеркаваны да 2023-га. Самы вялікі іх аб'ём атрымае Італія — амаль 209 мільярдаў еўра (81 мільярд у выглядзе грантаў і амаль 128 мільярдаў — ільготных пазык).

Для вяртання вялізнага доўгу ў 750 мільярдаў еўра ЕС мае намер увесці «інавацыйныя падаткі», у прыватнасці, падатак на неперапрацаваны пластык, лічбавыя транзакцыі, асаблівы рэжым мытных пошлін на тавары з краін «з ніжэйшымі кліматычнымі стандартамі, чым у Еўрасаюзе». Гэта непазбежна прывядзе да росту цэн практычна на ўсе імпартныя пазіцыі — фактычна 90 % спажывецкіх тавараў на паліцах еўрапейскіх крам. Пытанне ў тым, ці ўдасца выкарыстоўваць узятыя ў крэдыт грошы так, каб яны прынеслі больш прыбытку, чым будзе каштаваць гэты абавязак.

### Плюсы і мінусы

Прэзідэнт Францыі адзначыў, што лідары ЕС упершыню ў гісторыі дамовіліся размяшчаць агульныя даўгавыя абавязацельствы Еўрасаюза. Такім чынам, грошы ў доўг возьме ўвесь ЕС, а не асобныя яго краіны, як было раней. На практыцы гэта азначае, што агульную пазыку члены саюза будуць вяртаць па тым жа прынцыпе, па якім будуецца бюджэт супольнасці, — краіна плаціць у залежнасці ад таго, якую ўдзельную вагу мае яе эканоміка ў агульнаеўрапейскай і якой пакупной здольнасцю валодае яе насельніцтва.

Рашэнне аб фарміраванні агульнай пазыкі можа мець як пазітыўныя, так і разбуральныя наступствы для ўсяго еўрапейскага праекта. Сярод пазітыўных фактараў — дасягненне пагаднення, якое дазволіць у найбліжэйшыя гады ажывіць эканоміку мільярдамі пазыковых сродкаў, набыццё Еўрасаюзам іміджу «сацыяльнага праекта», які справядліва пераразмяркоўвае рэсурсы паміж багатымі і беднымі краінамі, і новы крок да павышэння ступені інтэграцыі супольнасці, атрымання прынцыпова новых паўнамоцтваў Брусэлем і паслаблення пазіцый нацыянальных урадаў. Аднак прыцягненне ў эканоміку 750 мільярдаў танных дзяржаўных грошай не гарантуе ні яе эфектыўнасці, ні яе паўнавартаснага аднаўлення, у той час як даўгавы цяжар для ўсіх без выключэння краін ЕС значна ўзрасце, а ён і так ужо ў цэлага іх шэрагу перавышае 100 % ВУП.

Уся ідэя гэтага плана заключаецца ў тым, каб магутнай фінансавай плынню падштурхнуць эканоміку да аднаўлення і росту, а затым без асаблівага напружання аддаць падаткі. Аднак практыка як бізнесу, так і дзяржкіравання (згадаем нядаўнюю гісторыю сусветнага фінансавага крызісу, пасля якога ў Еўропе настаў вельмі цяжкі крызіс суверэннай запазычанасці) сведчыць, што падобная камбінацыя спрацоўвае далёка не заўсёды. Вельмі сур'ёзным «невядомым» у гэтым ураўненні застаецца магчымая другая хваля пандэміі. Нават без яе ўліку Еўракамісія прагназуе, што ў 2020 годзе спад ВУП супольнасці складзе 8,3 працэнта.

Ліпеньскі саміт яскрава паказаў, што фрагментацыя Еўрасаюза глыбокая і што нацыянальныя інтарэсы часта пераважаюць, адзначыў gazeta.ru кіраўнік аддзела макрааналізу Saxo Bank Крыстафер Дэмбік. «Гэтае пагадненне, верагодна, будзе мець глыбокія доўгатэрміновыя наступствы для функцыянавання ЕС, узмоцніць раскол паміж яго Поўначчу і Поўднем і нават, магчыма, падштурхне Нідэрланды да выхаду з ЕС. Давер паміж дзяржавамі-членамі, заснаваны на добрасумленным супрацоўніцтве, падарваны», — лічыць эксперт Saxo Bank.

Цікавая рэакцыя на гістарычную падзею непасрэдна грамадзян еўрапейскіх краін пасля вяртання іх лідараў. Напрыклад, стала вядома, што трынаццаць чалавек падалі скаргу канцлеру юстыцыі Фінляндыі на дзеянні прэм'ер-міністра краіны Саны Марын падчас саміту ЕС, паведаміла дзяржаўная тэлерадыёвяшчальная кампанія YLE. Аўтары большасці зваротаў лічаць, што прэм'ер краіны дзейнічала насуперак пазіцыі канстытуцыйнага камітэта парламента, калі ўхваліла ўзяцце новых крэдытаў у рамках пакета мер па аднаўленні эканомікі ЕС.

**Захар БУРАК.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Пераадолець перашкоды, якія ўзнікаюць на гэтым тыдні, дазволіць упэўненасць у правільна выбраным напрамку і ўласных сілах. Не слухайце тых, хто будзе казаць, што вы ўсё робіце няправільна. А суддзі хто? Не давярайце ўсім без разбору, яны пераследуюць свае інтарэсы. Пятніца — дзень зносін. Вас чакаюць сустрэчы з людзьмі з даўняга мінулага і новыя знаёмствы. Толькі не варта дзяліцца сваімі сакрэтамі. Выхадныя паспрабуйце правесці з каханым чалавекам, інакш у вас могуць з'явіцца падставы для рэўнасці.

**ЦЯЛЕЦ.** У пачатку тыдня прааналізуйце падзеі, у эпіцэнтры якіх вы раптам апынуліся. Серада — удалы дзень для сур'ёзнай гутаркі або важнага кроку. У чацвер вам увесь дзень будзе спадарожнічаць добры настрой, можна смела ўвасабляць у жыццё самыя авантурныя планы, не асцерагаючыся ўскладненняў. У суботу будзьце асцярожныя, не верце ліслівым словам — хутчэй за ўсё, гэта падман. Выхадныя правядзіце на прыродзе.

**БЛІЗНЯТЫ.** На рабоце вам, магчыма, давядзецца вярнуцца да старых праектаў, і яны прынясуць новы прыбытак. Усё складваецца ўдала, і вы зможаце захоўваць раўнавагу, знаходзіцца ў спакоі, не дапускаць мітусні і не выяўляць спешкі ў справах. Пятніца запатрабуе максімальнай канцэнтрацыі, затое абяцае поспех у складаных перамовах. Вы поўныя сіл, так што дзейнічайце: усё атрымаецца, не ўпускайце шанц многае змяніць да лепшага.

**РАК.** У панядзелак займайцеся толькі тымі справамі, якія ўжо пачаты і патрабуюць працягу. Аўторак прынясе атмасферу лёгкасці і натуральнасці. Радуйцеся жыццю і спрабуйце падтрымліваць гармонію ў душы і ў сям'і на ўвесь астатні тыдзень. У чацвер праявіце як мага больш цярпення і мяккасці ў зносінах з блізкімі. Гэты дзень небяспечны сваркамі і канфліктамі. У нядзелю паспрабуйце не паддавацца шкодным уплывам і спакусам.

**ЛЕЎ.** Цяпер вам неабходна сабрацца і сканцэнтравацца перад вырашальным рыўком. Абыходзьце вострыя вуглы — лепш не прыцягваць да сябе залішняй увагі. Тыдзень будзе даволі напружаны. Работы назбіралася вельмі шмат, і вы, як заўсёды, незаменныя, таму з адпачынкам давядзецца крыху пачакаць. Будзьце ўважлівыя з дакументамі і справаздачамі. У сераду з'явіцца магчымасць даведацца пра штосьці важнае, не прапусціце неабходную інфармацыю. У пятніцу можа ўзнікнуць дылема: пайсці ў адпачынак або яшчэ папрацаваць над выпраўленнем фінансавага становішча. Вырашаць вам, але ў любым выпадку ўдзяляйце больш увагі дзецям.

**ДЗЕВА.** Вашы справы пойдуць угару пры ўмове, што не будзеце крытыкаваць калег і спрабаваць усім даказаць, што найлепш ведаеце, як трэба працаваць. Дарэмная мітусня вакол вас можа выклікаць раздражненне. Паспрабуйце расслабіцца і жывіце з задавальненнем. Не час плесці інтрыгі, яны павернуцца супраць вас. Затое неспадзявана дапамогуць сваякі, ад якіх вы нічога не чакаеце. Не ламайце галаву, спрабуючы зразумець іх бескарыслівасць, — проста так склаліся абставіны. У нядзелю пазбягайце мітусні, пабудзьце ў адзіноце.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні паспрабуйце зразумець, ці задавальняе вас тая роля, якую вы зараз выконваеце на рабоце і ў сям'і. Калі не, то вы даволі лёгка зможаце ад яе адмовіцца. Агледзьцеся па баках і цвяроза, без ілюзій зірніце на сваё жыццё, бо надышоў момант канструктыўных змен. Пятніца — удалы дзень для рэалізацыі задуманага. Паспрабуйце дамагчыся жаданага, аднак рэалістычна разлічвайце свае сілы.

**СКАРПІЁН.** Удалы тыдзень, калі вы зможаце пазбавіцца ад непатрэбнага грузу і будзеце павольна, але ўпэўнена прасоўвацца да вызначаных мэт. Можаце быць адкрытымі і не хаваць сваіх пачуццяў, таму што вакол вас сапраўды блізкія людзі і аднадумцы, і разам вы здольныя горы звярнуць. Зоркі абяцаюць масу задавальненняў у асабістым жыцці і вялікі прыбытак у прафесійнай сферы.

**СТРАЛЕЦ.** Цяпер не час штосьці мяняць — варта расслабіцца і добрасумленна выконваць сваю справу. Не ствярайце для сябе лішніх праблем з-за вашай гіперадказнасці і празмернага імкнення кантраляваць усё на свеце. Усім не дапаможаш, а вось вас могуць выкарыстаць, а потым кінуць. Будзьце ўважлівыя ў фінансавых справах і пры стварэнні новых праектаў. У чацвер можа парадаваць цікавая інфармацыя. У выхадныя ўдзяляйце больш увагі блізкім людзям.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні вас могуць паставіць у тупік. Магчыма, давядзецца рабіць тое, чаго вы раней не рабілі. Што ж, шмат чаму можна навучыцца на хаду. Аднак авантурныя прапановы пагражаюць завесці вас у неймаверныя нетры, так што будзьце асцярожныя. Серада абяцае падарыць радасць ад зносін з сябрамі. У чацвер і пятніцу ўдасца прадэманстраваць прафесіяналізм і сваю незаменнасць на рабоце, што можа абярнуцца для вас узнагародай.

**ВАДАЛІЎ.** Ваша хваляванне з нагоды ўласных магчымасцяў беспадстаўнае. Паспрабуйце спыніцца на чымсьці і ідзіце да канца. Сітуацыя на рабоце зменіцца да лепшага, толькі не percha старайцеся з арыгінальнасцю. Увасабляючы запаветныя планы ў жыццё, варта ўсё ж улічваць меркаванне блізкіх. Навядзіце нарэшце парадак і пазбаўце свой дом ад непатрэбнага, немаведама калі назапашанага хламу. У выхадныя можаце сутыкнуцца з падступствам і нават здрадай.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні пажадана праяўляць больш фантазіі, пачуцця гумару і аптымізму. Старайцеся ўсюды знаходзіць нестандартныя рашэнні, гэта істотна дапаможа і дома, і на рабоце. Добра было б спакайней ставіцца да крытыкі, накіраванай у ваш адрас. Галоўнае — не пасварыцеся з начальствам і калегамі. Калі ў вас атрымаецца менш гаварыць і больш слухаць, гэта будзе найлепшая стратэгія. Зносіны з сябрамі ў выхадныя прынясуць нямала прыемных хвілін і падымуць настрой.

Даты | Падзеі | Людзі

**25 ЛІПЕНЯ**

У краіне

**1840** год — нарадзіўся Юльян Фаміч Крачкоўскі, беларускі фалькларыст, этнограф, археолаг, гісторык, педагог. Выкладаў у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, працаваў інспектарам народных вучылішчаў Тульскай губерні (Расія) і Віленскай навучальнай акругі, дырэктарам Полацкай настаўніцкай семінарыі і Віленскага настаўніцкага інстытута. У 1888—1902 гадах — старшыня Віленскай археалагічнай камісіі. Даследаваў сямейныя і каляндарна-аграрныя абрады беларусаў, збіраў беларускі фальклор (песні, прыказкі, легенды, казкі). Аўтар прац па гісторыі царквы.



**1905** год — нарадзіўся Ілары (Іларыён Мацвеевіч) Барашка, беларускі пісьменнік. Скончыў БДУ, Кінаакадэмію ў Маскве. Працаваў на кінастудыі «Белдзяржкіно» ў Ленінградзе. З 1924-га публікаваў апавяданні, нарысы, бытавыя замалёўкі. Аўтар зборнікаў «У прасторы», «Блізкія далі», сцэнарыяў мастацкіх і дакументальных фільмаў «Дняпро ў агні», «Георгій Скарына», казак і апавяданняў для дзяцей.

У гэты ж дзень нарадзіўся Міхаіл Міхайлавіч Кулікоў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у 1944-м.

**1935** год — нарадзіўся Леанід Адамавіч Сасноўскі, беларускі вучоны ў галіне механікі, заснавальнік трыбафатыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Украіны.

У свеце

**1575** год — нарадзіўся Крыстаф Шэйнер, нямецкі астраном, фізік і матэматык. У 1611-м выявіў плямы на Сонцы. Склаў карту Месяца.

**1855** год — нарадзіўся Юльян Андрэевіч Кулакоўскі, рускі філолаг, адзін з класікаў філалогіі, археолаг, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН. Аўтар аднаго з найлепшых аглядаў візантыйскай гісторыі ў рускай навуковай літаратуры, трохтомнай працы «Гісторыя Візантыі», нарыса «Аланы па звестках класічных і візантыйскіх пісьменнікаў», манаграфіі «Мінулае Таўрыды».

**1905** год — нарадзіўся Эліяс Канеці, аўстрыйскі і брытанскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі. Аўтар рамана «Асляпленне», п'есы «Камедыя ганарыстасці», трактата «Маса і ўлада», шматлікіх эсэ і вострахарактарных мініяцюр.



**1935** год — у Маскве ў абстаноўцы ўзрослай пагрозы фашызму і вайны распачаўся VII кангрэс Камуністычнага інтэрнацыяналу, які ўвайшоў у гісторыю як кангрэс барацьбы за адзіны працоўны і народны фронт. Працягваўся да 20 жніўня.

Так гаварыў...

**П'ЕР РАНСАР:**

*«Перад жаночай прыгажосцю*
*нямоглымі мы сталі,*
*Яна мацней багоў, людзей, агню*
*і сталі».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.12 | 21.19 | 16.07 |
| Віцебск — | 4.55 | 21.15 | 16.20 |
| Магілёў — | 5.02 | 21.09 | 16.07 |
| Гомель — | 5.06 | 20.58 | 15.52 |
| Гродна — | 5.29 | 21.33 | 16.04 |
| Брэст — | 5.37 | 21.26 | 15.49 |

### Месяц

***Маладзік 20 ліпеня.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.*** *Арсенія, Гаўрылы, Івана, Міхаіла, Сымона, Фёдара.*
***К.*** *Валянціны, Валянціна, Міхала, Рудольфа, Якуба.*



Фота Вікторыі МІРОНЬНЫ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Цікава, адкуль ты ведаеш пра ўсё тое, чаго не раіш рабіць нашым дочкам?

**— Ой, Наталля, вы такая разумная!**

**— Я не разумная, я вопытная. Была б разумная — не была б такая вопытная.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2246.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 ліпеня 2020 года.